*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!*
*ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ*



# Наша слова

**Газета выходзіць з сакавіка 1990 года** **№ 2 (1257) 13 СТУДЗЕНЯ 2016 г.**

## Дарагія сябры “Нашага слова”!

У гэтым квартале колькасць падпісчыкаў рэзка ўпала, пра што папярэджвалася на мінулым паседжанні Рады. На заклік Рады да рэгіянальных арганізацый папрацаваць на падпіску адрэагавалі Баранавічы, Докшыцы, Наваполацк, Орша, Салігорск, Слонім, Асіповічы, Гарадзенскі раён. Назіраецца рост падпіскі на 1-2 асобнікі ў некалькіх іншых раёнах. Павялічылася падпіска ў Менску, але ў цэлым праблема застаецца.

| | Кастрычнік | Студзень |
|---|---|---|
| **Берасцейская вобласць:** | | |
| Баранавічы р.в. | 13 | 22 |
| Бяроза р.в. | 8 | 8 |
| Белаазёрск р.в. | 1 | 1 |
| Бярэсце гор. | 9 | 6 |
| Ганцавічы р.в. | 19 | - |
| Драгічын р.в. | - | 1 |
| Жабінка р.в. | 1 | - |
| Іванава р.в | 1 | 1 |
| Івацэвічы р. в. | 6 | 7 |
| Камянец р.в. | 1 | 1 |
| Кобрын гор. | 2 | 2 |
| Лунінец гор. | 2 | 1 |
| Ляхавічы р.в. | 1 | - |
| Маларыта р.в. | 1 | - |
| Пінск гор. | 6 | 5 |
| Пружаны р.в. | 5 | 5 |
| Столін р.в. | 1 | 1 |
| **Усяго:** | **77** | **61** |
| **Віцебская вобласць:** | | |
| Бешанковічы р.в. | 1 | 2 |
| Браслаў р.в. | 1 | 1 |
| Віцебск гор. | 21 | 21 |
| Віцебск РВПС | 1 | 3 |
| Верхнедзвінск р.в. | 4 | 4 |
| Глыбокае р.в. | 19 | 9 |
| Гарадок р.в. | 5 | 5 |
| Докшыцы р.в. | 1 | 6 |
| Дуброўня р.в. | 1 | 1 |
| Лёзна р.в. | 1 | 1 |
| Лепель р. в. | 1 | 1 |
| Міёры р.в. | 2 | 3 |
| Наваполацк гор. | 16 | 20 |
| Орша гор. | 4 | 11 |
| Полацк гор. | 15 | 3 |
| Паставы р.в. | 12 | 14 |
| Расоны р.в. | 1 | 1 |
| Сянно р.в. | 2 | 2 |
| Талочын р.в. | 2 | 1 |
| Ушачы р.в. | 2 | 2 |
| Чашнікі р.в. | 1 | 1 |
| Шаркоўшчына р.в. | 8 | 7 |
| Шуміліна р.в. | 1 | - |
| **Усяго:** | **122** | **119** |
| **Менская вобласць:** | | |
| Беразіно р.в. | 3 | 3 |
| Барысаў гор. | 9 | 7 |
| Вілейка гор. | 3 | 3 |
| Валожын гор. | 7 | 9 |
| Дзяржынск р.в. | 9 | 10 |
| Клецк р.в. | 1 | - |
| Крупкі р.в. | 5 | 3 |
| Капыль р.в. | 1 | 1 |
| Лагойск | 4 | 3 |
| Любань р.в. | 1 | 1 |
| Менск гор. | 242 | 250 |
| Менск РВПС | 8 | 9 |
| Маладзечна гор. | 11 | 10 |
| Мядзель р.в. | 4 | 4 |
| Пухавічы РВПС | 4 | 5 |
| Нясвіж р.в. | 21 | 4 |
| Смалявічы р.в. | 1 | 1 |
| Слуцк гор. | 5 | 7 |
| Салігорск гор. | 6 | 20 |
| Ст. Дарогі р.в. | 2 | - |
| Стоўбцы р.в. | 24 | 4 |
| Узда р.в. | 1 | 1 |
| Чэрвень р.в. | 4 | 3 |
| **Усяго:** | **376** | **358** |
| **Гомельская вобласць:** | | |
| Буда-Кашалёва | 3 | 3 |
| Брагін р.в. | 1 | - |
| Ветка р.в. | 2 | 2 |
| Гомель гор. | 25 | 24 |
| Гомель РВПС | - | 1 |
| Добруш р.в. | 22 | - |
| Ельск р.в. | 2 | - |
| Жыткавічы р.в. | 17 | 16 |
| Жлобін гор. | 3 | 2 |
| Калінкавічы гор. | 2 | 1 |
| Карма р.в. | - | - |
| Лельчыцы р.в. | 1 | - |
| Лоеў р.в. | - | - |
| Мазыр гор. | 3 | 1 |
| Акцябарскі р.в. | 1 | 1 |
| Нароўля р.в. | - | - |
| Петрыкаў р.в. | 2 | - |
| Рэчыца гор. | 2 | 1 |
| Рагачоў гор. | 1 | 1 |
| Светлагорск гор. | 2 | 2 |
| Хойнікі р.в. | 1 | - |
| Чачэрск р.в. | 2 | - |
| **Усяго:** | **92** | **55** |
| **Гарадзенская вобласць:** | | |
| Бераставіца | 3 | 3 |
| Ваўкавыск гор. | 8 | 8 |
| Воранава р.в. | 20 | 4 |
| Гародня гор. | 37 | 35 |
| Гародня РВПС | 11 | 15 |
| Дзятлава р.в. | 15 | 13 |
| Зэльва р.в. | 1 | 1 |
| Іўе р.в. | 15 | 3 |
| Карэлічы р.в. | 3 | 3 |
| Масты р.в. | 3 | 3 |
| Навагрудак гор. | 4 | 2 |
| Астравец р.в. | 4 | 4 |
| Ашмяны р.в. | 2 | 4 |
| Смаргонь гор. | 3 | 3 |
| Слонім гор. | 6 | 14 |
| Свіслач р.в. | 4 | 4 |
| Шчучын р.в. | 2 | 2 |
| Ліда | 45 | 14 |
| **Усяго:** | **187** | **135** |
| **Магілёўская вобласць:** | | |
| Бабруйск гор. | 4 | 4 |
| Бялынічы р.в. | 1 | - |
| Быхаў р.в. | 3 | - |
| Глуск р.в. | 1 | - |
| Горкі гор. | 1 | 1 |
| Дрыбін р.в. | 1 | - |
| Кіраўск р.в. | 1 | - |
| Клічаў р.в. | 1 | - |
| Клімавічы р.в. | 1 | - |
| Касцюковічы р.в. | 1 | 1 |
| Краснаполле р.в. | 1 | - |
| Крычаў р.в. | 1 | - |
| Круглае р.в. | 2 | 2 |
| Мсціслаў р.в. | 2 | 1 |
| Магілёў гор. | 61 | 28 |
| Магілёў РВПС | 1 | - |
| Асіповічы гор. | 11 | 15 |
| Слаўгарад р.в. | 1 | 1 |
| Хоцімск р.в. | 1 | - |
| Чэрыкаў р.в. | 2 | 2 |
| Чавусы р.в. | 1 | - |
| Шклоў р.в. | 1 | 2 |
| **Усяго** | **100** | **57** |
| **Усяго на краіне:** | **954** | **785** |

ISSN 2073-7033
9 772073 703003 >

## 100 гадоў з дня нараджэння Уладзіслава Чарняўскага



**Уладзіслаў ЧАРНЯЎСКІ** (14.01.1916; засц. Амружын, цяпер Ашмянскі раён, Гарадзенская вобласць - 22.12.2001, Менск) - беларускі каталіцкі святар. Перакладчык Бібліі і Катэхэзіса на беларускую мову.

Паходзіць з сялянскай сям'і, скончыў 4 класы Вішнеўскай школы, вучыўся ў Крэўскай гімназіі. У 1931-1933 навучаўся ў настаўніцкай гімназіі ў Барунах Ашмянскага павета.

У 1934 пад уплывам свайго дзядзькі кс. Францішка Чарняўскага паступіў у гімназію ў Друі пры кляштары марыянаў. У 1938 г. скончыў гімназію ў Друі і паступіў у навіцыят (паслушніцтва) Кангрэгацыі айцоў марыянаў. У сувязі з высяленнем улетку польскай паліцыяй 6 айцоў марыянаў з кляштара ў Друі правёў год навіцыяту ў мястэчку Скужэц (Сядлецкі павет, Люблінскае ваяводства, Польшча ). Затым паступіў у Семінарыю святога Восіпа ў Вільні, якую скончыў у 1945 годзе.

У кастрычніку 1944 г. атрымаў пасвячэнне на капланства ад летувіскага біскупа Мечыслава Райніса. Першую імшу адправіў у Крэве на беларускай мове. Пасля вярнуўся ў Вільню і пэўны час працаваў у касцёле Св. Ігната. Пасля арышту кс. Адама Станкевіча разглядаўся як кандыдат на ягонае месца, але прызначэнне не адбылося. Пазней служыў у парафіях на ўсходзе Летувіскай ССР (Укмэрге, Варэна, Эйшышкі і інш.). Затым перавёўся ў касцёл Святой Тройцы ў вёсцы Войстам (Смаргонскі р-н). У кастрычніку 1953 г. стаў пробашчам касцёла Панны Марыі ў в. Вішнеў (Валожынскі раён, Менская вобласць), дзе паслядоўна да канца 1980-ых гг. карыстаўся ў пастырстве беларускай мовай.

Праводзіў беларускамоўныя імшы нават да II Ватыканскага Сабору (1962-1965) які дазволіў карыстацца нацыянальнымі мовамі. Рымскі папа рабіў захады перад савецкай амбасадай у Рыме пра прызначэнне Чарняўскага біскупам у Беларусі, але складаныя адносіны паміж касцельным польскім кіраўніцтвам, афіцыйнай Масквой і Ватыканам не дазволілі гэтаму ажыццявіцца.

На беларускамоўныя службы ў Вішнева, і проста па маральную падтрымку прыязджалі шматлікія беларускія грамадска-палітычныя дзеячы. Камітэтам Ушанавання ганараваны ордэнам "Гонар Айчыны" (25 сакавіка 1997) і адпаведным дыпломам. Занесены ў Кнігу гонару "Руплііўцы твае, Беларусь".

***Вікіпедыя.***

## 75 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Мулявіна



**Уладзімір Георгіевіч МУЛЯВІН** (12 студзеня 1941, Свярдлоўск - 26 студзеня 2003, Масква, Пахаваны на Усходніх могілках, Менск) - беларускі артыст, кампазітар, народны артыст Беларусі (1979), Заслужаны дзеяч культуры Польшчы (1980), народны артыст СССР (1990), заснавальнік і мастацкі кіраўнік беларускага вакальна-інструментальнага ансамбля "Песняры".

Нарадзіўся 12 студзеня 1941 года ў Свярдлоўску. Маці - Акуліна Сяргееўна. Бацька - рабочы завода "Уралмаш", сям'ю пакінуў, калі Уладзіміру было 3 гады.

У дзіцячым узросце Валодзя пачаў захапляцца музыкай і ў 12 гадоў пачаў граць на гітары.

У 1956 годзе - пасля школы паступіў у Свярдлоўскае музычнае вучылішча, на аддзяленне струнных інструментаў. Быў выключаны з вучылішча за захапленне джазам, хутка быў прыняты назад, але кінуў па ўласным жаданні. У 1959 годзе ажаніўся з Лідзіяй Крамальскай. У 1961 годзе ў іх нарадзілася дачка Марына, а ў 1975 годзе - сын Уладзімір (памёр у 2006 годзе), у 1975 годзе шлюб з Л. Кармальскай быў скасаваны. У 1958-1963 гадах працаваў музыкам у розных абласных філармоніях. У 1963 годзе быў запрошаны на працу ў Беларускую дзяржаўную філармонію. У 1965-1967 гадах служыў у Савецкім войску ў каля Менска. Стварыў у вайсковай частцы вакальны квартэт, прымаў удзел у арганізацыі ансамбля Беларускай вайсковай акругі.

Пасля сканчэння службы ў войску вярнуўся ў Беларускую дзяржаўную філармонію, пры якой у 1968 годзе быў створаны вакальна-інструментальны ансамбль "Лявоны". У 1970 годзе ансамбль, мастацкім кіраўніком якога быў Уладзімір Мулявін, змяніў назву на "Песняры".

У 1976 з ансамблем гастраляваў у ЗША разам з "Нью Крысці Менестрэлс".

Другі раз ажаніўся з Святланай Канстанцінаўнай Слізскай. У 1976 годзе ў іх нарадзілася дачка Вольга.

У 1981 годзе развёўся са С. Слізскай і ажаніўся з актрысай Святланай Пенкінай. У 1982 годзе ў іх нарадзіўся сын Валерый.

14 траўня 2002 года Уладзімір Мулявін патрапіў у аўтакатастрофу. Праз 8 месяцаў памёр у Маскве ў шпіталі імя Бурдэнкі.

Творчасць Уладзіміра Мулявіна - наш нацыянальны здабытак. Гэта адзін з тых складнікаў, на якіх будуюцца нашы нацыянальная свядомасць, патрыятызм, грамадзянскасць. Беларус не па крыві, ён быў ім па сваёй душы, светапоглядзе, па сваім сэрцы, па сваім гонары. Усё створанае Уладзімірам Мулявіным абуджае і выхоўвае гонар за нашу краіну, за прыналежнасць да беларускага народа.

З дзённікавых запісаў Уладзіміра Мулявіна: *“Пясняр, па маім разуменні, - гэта не толькі ўласна прафесіяналізм. Гэта — лад жыцця, паводзін, думак, мыслення. Я ўсё сваё свядомае жыццё вывучаю Купалу, Багдановіча, Коласа, якія з'яўляюцца для мяне прыкладам. Напісаў на іх вершы шэсць праграм і шчаслівы, што не толькі дакрануўся да гэтай паэзіі, але і многа даведаўся пра гэтых людзей’’*.

Паводле слоў удавы Уладзіміра Мулявіна, актрысы Святланы Пенкінай, ён быў у захапленні ад беларускай мовы, а калі пыталіся, чаму ён на ёй не размаўляе, адказваў: ***“Яна настолькі цудоўная, што я магу на ёй толькі спяваць”***.

Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (1970); Лаўрэат фестывалю песні "Залаты леў" (Лейпцыг, 1973); Лаўрэат 2-га фестывалю палітычнай песні (Хельсінкі, 1978); Галоўны прыз фірмы "Мелодыя" "Залаты дыск" (1982); Медаль Францыска Скарыны (1994); Ордэн Францыска Скарыны (2001).

21 студзеня 2001 года ў Маскве на Алеі зорак закладзена зорка ў гонар Уладзіміра Мулявіна і ансамбля "Песняры".

***Вікіпедыя.***

# Юбілейныя і памятныя даты 2016 года

## СТУДЗЕНЬ

**1 студзеня** - 80 гадоў з дня нараджэння **Анатоля Кудраўца** (1936-2014), беларускага празаіка, публіцыста, перакладчыка.

**1 студзеня** - 60 гадоў таму (1956 г.) пачаў перадачы Менскі тэлецэнтр.

**2 студзеня** - 75 гадоў з дня нараджэння **Паўла Савоські**, беларускага пісьменніка.

**2 студзеня** - 75 гадоў з дня нараджэння **Міхася Зарэмбы** (1941-2002), беларускага празаіка.

**2 студзеня** - 60 гадоў з дня нараджэння **Уладзіміра Кароткага**, беларускага літаратуразнаўца, кандыдата філалагічных навук, дацэнта.

**3 студзеня** - 70 гадоў з дня нараджэння **Тадэвуша Кандрусевіча**, беларускага рэлігійнага дзеяча, кіраўніка каталіцкай царквы ў Беларусі, арцыбіскупа, доктара тэалогіі.

**7 студзеня** - 25 гадоў таму (1991 г.) Пастановай урада БССР 7 студзеня і 25 снежня аб'яўлены нерабочымі днямі для святкавання Калядаў.

**8 студзеня** - 80 гадоў з дня нараджэння **Генадзя Каханоўскага** (1936-1994), беларускага гісторыка, краязнаўца, фалькларыста, літаратуразнаўца.

**9 студзеня** - 75 гадоў з дня нараджэння **Валянціны Ададуравай**, беларускай паэткі.

**12 студзеня** - 75 гадоў з дня нараджэння Народнага артыста СССР і Беларусі, заснавальніка ансамбля "Песняры" **Уладзіміра Мулявіна**.

**14 студзеня** - 100 гадоў з дня нараджэння **Уладзіслава Чарняўскага**, беларускага каталіцкага духоўніка, перакладчыка.

**15 студзеня** - 80 гадоў з дня нараджэння (1936-2011) **Янкі Сіпакова**, беларускага паэта, празаіка, перакладчыка, заслужанага дзеяча культуры Беларусі.

**16 студзеня** - 190 гадоў з дня нараджэння **Рамуальда Траўгута**, аднаго з кіраўнікоў



паўстання 1863-64 гг.

**20 студзеня** - 130 гадоў з дня нараджэння **Фабіяна Акінчыца** (1886-07.03.1943), палітычнага дзеяча.

**22 студзеня** - 110 гадоў з дня нараджэння **Андрэя Александровіча** (1906-1963), беларускага паэта.

**25 студзеня** - 70 гадоў таму назад у Гародні было створана абласное аддзяленне Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР.

**27 студзеня** - 200 гадоў з дня нараджэння **Апалінарыя Красоўскага**, беларускага архітэктара, педагога, прафесара.

**30 студзеня** - 95 гадоў з дня нараджэння **Івана Шамякіна**, беларускага пісьменніка, народнага пісьменніка Беларусі.

**Студзень.** 75 гадоў таму (1941 г.) на тэрыторыі Беларусі адкрыты залежы каменнай і калійных солей.

## ЛЮТЫ

**1 лютага** - 605 гадоў таму (1411 г.) у г. Торунь падпісаны **Торуньскі мірны дагавор** паміж Каралеўствам Польскім і ВКЛ, з аднаго боку, і Тэўтонскім ордэнам - з другога. Завяршылася Вялікая вайна (1409-1411 гг.).

**3 лютага** - 270 гадоў з дня нараджэння **Тадэвуша Касцюшкі.**



**7 лютага** - 470 гадоў з дня нараджэння **Фёдара Еўлашоўскага**, беларускага грамадска-культурнага дзеяча, пісьменніка.

**7 лютага** - 125 гадоў з дня нараджэння **Марыі Міцкевіч (Каменскай)**, беларускага педагога, жонкі Якуба Коласа.

**8 лютага** - 130 гадоў з дня нараджэння **Васіля Дружчыца**, беларускага гісторыка, педагога, прафесара. Загінуў у 1937 г.

**10 лютага** - 270 гадоў з дня нараджэння **Казіміра Кагнавіцкага**, беларускага гісторыка, педагога, доктара філасофіі.

**13 лютага** - 210 гадоў з дня нараджэння **Юліяна Корсака** (1806-1885), паэта і перакладчыка.

**14 лютага** - 110 гадоў з дня нараджэння **Мікалая Улашчыка** (1906-1986), беларускага гісторыка, археографа, археолага, этнографа, краязнаўца, літаратара.

**14 лютага** - 60 гадоў з дня нараджэння **Уладзіміра Ягоўдзіка**, беларускага пісьменніка.

**19 лютага** - 100 гадоў з дня нараджэння **Генрыка Барановіча**, беларускага грамадскага дзеяча на эміграцыі.

**21 лютага - МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ**.

**29 лютага** - 60 гадоў з дня нараджэння **Ніны Памецькі**, беларускага мовазнаўца, кандыдата філалагічных навук, дацэнта.

## САКАВІК

**1 сакавіка** - 80 гадоў з дня нараджэння **Лідзіі Савік**, беларускага літаратуразнаўца і крытыка.

**4 сакавіка** - 120 гадоў з дня нараджэння **Кандрата Крапівы** (Кандрат Кандратавіч Атраховіч, 1896 - 07.01. 1991), народнага пісьменніка Беларусі, драматурга.

**9 сакавіка** - 200 гадоў з дня нараджэння **Аляксандра Пагоскага** (1816-1874), педагога, пісьменніка, выдаўца.

**10 сакавіка** - 90 гадоў з дня нараджэння **Васіля Супруна**, беларускага паэта.

**11 сакавіка** - 615 гадоў таму (1401 г.) падпісана Віленска-Радамская унія - дзяржаўны і палітычны саюз ВКЛ і Каралеўства Польскага, накіраваны на барацьбу з нямецкай агрэсіяй.

**11 сакавіка** - 450 гадоў таму (1566 г.) зацверджаны 2-гі Статут ВКЛ.

**12 сакавіка** - 30 гадоў з дня адкрыцця ў Гародні гістарычна-культурнага клуба "Паходня".

**14 сакавіка** - 70 гадоў з дня нараджэння **Аляксандра Каваленя**, акадэміка-сакратара НАН Беларусі, доктара гістарычных навук.

**17 сакавіка** - 270 гадоў з дня нараджэння **Яна Давіда Голанда** (1746-1827), кампазітара, прыдворнага капель-майстра ў Радзівілаўскім тэатры ў Нясвіжы, аўтара беларускай аперэты "Агатка".

**17 сакавіка** - 120 гадоў з дня нараджэння **Ізі Харыка** (1896-1937), яўрэйска-беларускага паэта.

**18 сакавіка** - 95 гадоў таму (1921 г.) быў падпісаны Рыжскі мірны дагавор паміж РСФСР і УССР з аднаго боку і Польшчай з другога (без удзелу Беларусі), у адпаведнасці з якім Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна адышлі да Польшчы.

**20 сакавіка** - 120 гадоў з дня нараджэння **Майсея Кульбака**, яўрэйскага пісьменніка, культурнага дзеяча Беларусі. Загінуў у 1937 г.

**25 сакавіка - ДЗЕНЬ ВОЛІ.**

**30 сакавіка** - 85 гадоў з дня нараджэння **Аляксея Пяткевіча**, беларускага літаратуразнаўца, культуролага, кандыдата філалагічных навук, старшыні Гарадзенскай гарадской арганізацыі ТБМ.

**30 сакавіка** - 60 гадоў з дня нараджэння **Крысціны Лялько**, беларускай пісьменніцы, перакладчыцы і журналісткі.

## КРАСАВІК

**2 красавіка** - 25 гадоў з дня ўрачыстага адкрыцця ў Гарадзенскім універсітэце імя Я. Купалы факультэта беларускай філалогіі і культуры.

**3 красавіка** - 70 гадоў з дня нараджэння **Рычарда Смольскага**, беларускага тэатразнаўца, доктара мастацтвазнаўства, прафесара.

**5 красавіка** - 80 гадоў з дня нараджэння **Рамана Тармолы**, беларускага паэта.

**6 красавіка** - 70 гадоў з дня нараджэння **Валянціны Коўтун**, беларускай пісьменніцы.

**7 красавіка** - 80 гадоў таму назад у БССР уведзена ўсеагульнае пачатковае навучанне для дзяцей ва ўзросце з 8 да 11 гадоў.

**12 красавіка** - 475 гадоў з дня нараджэння **Іпація** (1541-1613), пісьменніка-палеміста, дзяржаўнага, палітычнага і царкоўнага дзеяча ВКЛ.

**12 красавіка** - 55 гадоў таму назад першы ў свеце арбітальны касмічны палёт вакол Зямлі здзейсніў лётчык-касманаўт **Юрый Гагарын** з беларускай Смаленшчыны.

**14 красавіка** - 75 гадоў з дня нараджэння **Полі Раксы**, польскай артысткі тэатра і кіно. З Ліды.

**15 красавіка** - 75 гадоў з дня нараджэння **Вячаслава Дашкевіча**, беларускага пісьменніка, журналіста.

**16 красавіка** - 60 гадоў з дня нараджэння **Пятра Маляўкі**, беларускага літаратуразнаўца, кандыдата філалагічных навук, дацэнта Гарадзенскага ўніверсітэта імя Я. Купалы.

**17 красавіка** - 125 гадоў з дня нараджэння **Язэпа Варонкі**, беларускага грамад-



скага і палітычнага дзеяча.

**20 красавіка** - 350 гадоў з дня нараджэння **Крыштафа Завішы** (1666-1721), пісьменніка-мемуарыста, перакладчыка, дзяржаўнага дзеяча.

**23 красавіка** - 130 гадоў з дня нараджэння пісьменніка **Змітрака Бядулі** (сапр. Плаўнік Самуіл Яўхімавіч, 1886 - 3.11.1941).

**24 красавіка** - 80 гадоў з дня нараджэння **Веры Рыч** (1936-2009), англійскай паэтэсы, перакладчыцы твораў беларускіх аўтараў.

**28 красавіка** - 60 гадоў з дня нараджэння **Антаніны Хатэнкі**, беларускай пісьменніцы.

**29 красавіка** - 95 гадоў з дня нараджэння **Міколы Ермаловіча**, беларускага гісторыка.

**29 красавіка** - 60 гадоў з дня нараджэння **Вольгі Зялёнкі**, беларускага мовазнаўца, кандыдата філалагічных навук, дацэнта.

**30 красавіка** - 70 гадоў з дня нараджэння **Вольгі Ляшчынскай**, беларускага мовазнаўца, доктара філалагічных навук, прафесара

**30 красавіка** - 60 гадоў з дня нараджэння **Ірыны Багдановіч**, беларускай паэткі, літаратуразнаўца, кандыдата філалагічных навук.

## ТРАВЕНЬ

**5 траўня** - 60 гадоў з дня нараджэння **Ігара Трусава**, беларускага гісторыка, культуролага, краязнаўца.

**6 траўня** - 170 гадоў з дня нараджэння **Генрыка Сянкевіча**, польскага пісьменніка.

**7 траўня** - 255 гадоў з дня нараджэння **Станіслава Юндзіла**, беларускага вучонага ў галіне батанікі, доктара філасофіі.

**8 траўня** - 75 гадоў з дня нараджэння **Лідзіі Лук'янавай**, беларускага гісторыка, кандыдата гістарычных навук, прафесара Гарадзенскага медуніверсітэта.

**9 траўня** - 75 гадоў з дня нараджэння **Маі Цыбульскай**, польскай паэткі, літаратуразнаўца, доктара філалогіі. З Ліды.

**10 траўня** - 60 гадоў з дня нараджэння **Вольгі Хамяковай**, беларускага літаратуразнаўца, кандыдата філалагічных навук, дацэнта.

**15 траўня** - 100 гадоў з дня нараджэння **Ніны Тарас**, беларускай паэткі.

**16 траўня** - 30 гадоў з дня адкрыцця ў Гародні музея Максіма Багдановіча.

**19 траўня** - 80 гадоў з дня нараджэння **Міхаіла Пілiпенкі**, доктара гістарычных навук, этнографа.

**20 траўня** - 75 гадоў з дня нараджэння **Мікалая Пятрыкевіча**, беларускага мовазнаўца, кандыдата філалагічных навук, дацэнта. Памёр у 1988 г.

**28 траўня** - 180 гадоў з дня нараджэння **Яна Карловіча**, беларускага этнографа, лінгвіста, музыказнаўцы.

**29 траўня** - 140 гадоў таму (1876 г.) у мястэчку Мар'іна Горка заснавана сельскагаспадарчая школа (цяпер сельскагаспадарчы каледж).

**29 траўня** - 70 гадоў таму назад у Менску пачалося будаўніцтва трактарнага завода.

## ЧЭРВЕНЬ

**1 чэрвеня** - 70 гадоў з дня нараджэння пісьменніка **Генрыха Далідовіча** (1946 г.).

**3 чэрвеня** - 230 гадоў з дня нараджэння **Канстанцына Тызенгаўза**, беларускага вучонага ў галіне арніталогіі.

**4 чэрвеня** - 100 гадоў з дня нараджэння **Уладзіміра Сіўко**, беларускага паэта. Памёр у 2003 г.

**5 чэрвеня** - 170 гадоў з дня нараджэння **Антона Будзіловіча**, рускага мовазнаўца-славіста, доктара філалагічных навук, прафесара, члена-карэспандэнта Расійскай Акадэміі навук.

**6 чэрвеня** - 175 гадоў з дня нараджэння **Элізы Ажэшкі** (1841-1910), беларускай польскамоўнай пісьменніцы, перакладчыцы, педагога.

**8 чэрвеня** - 55 гадоў **Вінцуку Вячорку**, грамадска-палітычнаму дзеячу, беларускаму мовазнаўцу.

**15 чэрвеня** - 120 гадоў з дня нараджэння **Паўла Каравайчыка**, беларускага грамадска-культурнага дзеяча, пісьменніка. Загінуў у 1937 г.

**18 чэрвеня** - 210 гадоў з дня нараджэння рэвалюцыянера-ўтапіста **Міхала Валовіча**.

**21 чэрвеня** - 275 гадоў з дня нараджэння **Жана Жалібера**, вучонага прыродазнаўца, кіраўніка Гарадзенскай медыцынскай акадэміі.

**22 чэрвеня** - 75 гадоў таму (1941 г.) пачалася Вялікая Айчынная вайна.

**29 чэрвеня** - 120 гадоў з дня нараджэння **Уладзіслава Казлоўскага** (1896-1943), беларускага паэта, публіцыста, перакладчыка, выдаўца, грамадскага дзеяча.

## ЛІПЕНЬ

**2 ліпеня** - 230 гадоў з дня нараджэння **Івана Лабойкі** (1786-1861), гісторыка, літаратуразнаўца, лінгвіста.

**5 ліпеня** - 90 гадоў з дня нараджэння **Міхаіла Лазарука**, педагога, літаратуразнаўцы.

**7 ліпеня** - 220 гадоў з дня нараджэння **Яна Чачота**, беларускага паэта, фалькларыста.

**9 ліпеня** - 70 гадоў з дня нараджэння **Уладзіміра Някляева**, беларускага палітыка, пісьменніка.

**12 ліпеня** - 75 гадоў з дня нараджэння **Алега Слукі**, доктара гістарычных навук, прафесара Інстытута журналістыкі БДУ.

**13 ліпеня** - 150 гадоў з дня нараджэння **Напалеона Чарноцкага**, беларускага публіцыста, перакладчыка, лекара. Памёр у 1937 г.

**14 ліпеня** - 200 гадоў з дня нараджэння **Гераніма Марцінкевіча** (1816-1864), беларускага і польскага паэта, празаіка, драматурга.

**15 ліпеня** - 140 гадоў з дня нараджэння **Алаізы Пашкевіч (Цёткі)**, беларускай пісьменніцы, грамадскай і культурнай дзяячкі.

**16 ліпеня** - 160 гадоў з дня нараджэння **Адама Макрэцкага**, беларускага і польскага вайскоўца, генерала.

**20 ліпеня** - 160 гадоў з дня нараджэння **Часлава Пяткевіча** (1856-1936), беларускага і польскага этнографа, фалькларыста.

**22 ліпеня** - 80 гадоў з дня нараджэння **Валянціны Гаявой**, народнай артысткі Беларусі, мастацкага кіраўніка і галоўнага балетмайстра харэаграфічнага ансамбля "Харошкі".

**22 ліпеня** - 80 гадоў з дня нараджэння **Вячаслава Чамярыцкага**, беларускага літаратуразнаўца, кандыдата філалагічных навук.

**24 ліпеня** - 255 гадоў з дня нараджэння **Якуба Ясінскага**, аднаго з кіраўнікоў паўстання 1794 года.

**24 ліпеня** - 120 гадоў з дня нараджэння **Аляксандра Орсы**, беларускага педагога, доктара прыродазнаўства. Памёр у 1959 г.

**27 ліпеня - ДЗЕНЬ ПРЫНЯЦЦЯ ДЭКЛАРАЦЫІ АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ СУВЕРЭНІТЭЦЕ БЕЛАРУСІ.**

# Юбілейныя і памятныя даты 2016 года

ЖНІВЕНЬ

**3 жніўня** - 50 гадоў з дня нараджэння **Ганны Скаржынскай-Савіцкай**, беларускай дзіцячай пісьменніцы.

**4 жніўня** - 340 гадоў з дня нараджэння **Дамініка Рудніцкага**, беларускага і польскага пісьменніка.

**5 жніўня** - 655 гадоў з дня нараджэння вялікага князя літоўскага **Аляксандра** (1461- 19.08. 1506).

**5 жніўня** - 510 гадоў таму (1506 г.) адбылася Клецкая бітва, у якой войскі ВКЛ перамаглі крымскіх татараў.

**5 жніўня** - 130 гадоў з дня нараджэння ў м. Дакудава Лідскага павета **Браніслава Яманта**, мастака, прафесара Віленскага ўніверсітэта імя Стэфана Баторыя, дэкана мастацкага факультэта і прафесара Торуньскага ўніверсітэта.

**6 жніўня** - 70 гадоў з дня нараджэння **Ніны Канунніковай**, беларускага біёлага, доктара біялагічных навук, прафесара Гарадзенскага ўніверсітэта імя Я. Купалы.

**9 жніўня** - 90 гадоў з дня нараджэння **Янкі Запрудніка**, беларускага грамадска-палітычнага дзеяча на эміграцыі, гісторыка.

**11 жніўня** - 160 гадоў з дня нараджэння **Уладзіміра Дабравольскага** (1856-07.05. 1920) этнографа, фальклярыста, лексікографа.

**12 жніўня** - 125 гадоў з дня нараджэння **Мікалая Чарвякоўскага**, беларускага краязнаўца, бібліяфіла.

**18 жніўня** - 125 гадоў з дня нараджэння **Макара Краўцова**, беларускага пісьменніка, грамадска-палітычнага дзеяча. Загінуў у 1939 г.



**18 жніўня** - 80 гадоў з дня нараджэння **Ніны Гаўрош**, беларускага мовазнаўца, кандыдата філалагічных навук, прафесара.

**22 жніўня** - 125 гадоў таму (1891 г.) у Віцебску заснавана аб'яднанне сясцёр міласэрнасці Таварыства Чырвонага Крыжа - адно з першых у Беларусі.

**23 жніўня** - 220 гадоў з дня нараджэння **Францішка Міцкевіча**, удзельніка паўстання супраць Расіі ў 1830-31 гг.

**25 жніўня** - 25 гадоў таму (1991 г.) Вярхоўны Савет Беларускай ССР надаў статус Канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб суверэнітэце Беларускай ССР. Беларусь стала незалежнай дзяржавай.

**27 жніўня** - 110 гадоў з дня нараджэння **Сяргея Новіка-Пеюна.**

**28 жніўня** - 80 гадоў з дня нараджэння паэта **Генадзя Бураўкіна**.

**30 жніўня** - 80 гадоў з дня нараджэння **Святланы Мусіенкі**, беларускага літаратуразнаўца, доктара філалагічных навук, прафесара.

ВЕРАСЕНЬ

**4 верасня** - 80 гадоў з дня нараджэння **Сакрата Яновіча**, беларускага пісьменніка ў Польшчы.

**6 верасня** - 70 гадоў з дня нараджэння **Вячаслава Селяменева**, кандыдата гістарычных навук, дырэктара Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

**8 верасня** - 80 гадоў з дня нараджэння **Сяргея Габрусевіча**, беларускага філосафа, культуролага, кандыдата філасофскіх навук, прафесара.

**14 верасня** - 110 гадоў з дня выхаду (1906) газеты "Наша доля", першага легальнага выдання на беларускай мове. Выходзіла да 14 снежня 1906 г. у Вільні.

**19 верасня** - 25 гадоў таму (1991 г.) Вярхоўны Савет БССР зацвердзіў назву нашай дзяржавы "Рэспубліка Беларусь" і прыняў новыя Дзяржаўныя сімвалы: герб "Пагоня" і бела-чырвона-белы сцяг (прымяняліся да 15 траўня 1995 г.).

**21 верасня** - 140 гадоў таму (1876 г.) у мястэчку Свіслач заснавана настаўніцкая семінарыя, якая існавала да 1921 г.

**22 верасня** - 65 гадоў **Уладзіміру Коласу**, беларускаму кінарэжысёру, заснавальніку і дырэктару Беларускага гуманітарнага ліцэя.

**23 верасня** - 80 гадоў з дня нараджэння **Сямёна Шарэцкага**, беларускага дзяржаўна-палітычнага дзеяча, эканаміста, доктара эканамічных навук, прафесара.

**24 верасня** - 375 гадоў з дня нараджэння **Станіслава Незабітоўскага**, беларускага грамадскага і культурнага дзеяча.

**26 верасня - ЕЎРАПЕЙСКІ ДЗЕНЬ МОЎ.**

**29 верасня** - 125 гадоў з дня нараджэння **Аркадзя Смоліча**, беларуска дзяржаўна-палітычнага дзеяча, вучонага ў галіне эканомікі, геаграфіі Беларусі, прафесара. Загінуў у 1938 годзе.

**30 верасня** - 85 гадоў з дня нараджэння **Ніла Гілевіча**, Народнага паэта Беларусі.

КАСТРЫЧНІК

**4 кастрычніка** - 275 гадоў з дня нараджэння **Францішка Карпінскага** (1741-1825), паэта сентыменталіста, асветніка.

**6 кастрычніка** - 140 гадоў з дня нараджэння **Яна Булгака**, беларускага фотамастака, этнографа.

**9 кастрычніка** - 420 гадоў таму (1596 г.) заключана Берасцейская царкоўная унія.

**10 кастрычніка** - 220 гадоў з дня нараджэння **Міхала Без-Карніловіча** (1796-1862), беларускага гісторыка, краязнаўца, этнографа.

**13 кастрычніка** - 120 гадоў з дня нараджэння **Мікалая Шчакаціхіна** (1896-1940), беларускага мастацтвазнаўца, гісторыка, тэарэтыка мастацтва, педагога.

**15 кастрычніка** - 55 гадоў з часу адкрыцця (1961 г.) у Крычаве раённага краязнаўчага музея.

**16 кастрычніка** - 100 гадоў з дня адкрыцця ў Свіслачы беларускай настаўніцкай семінарыі.

**18 кастрычніка** - 110 гадоў з дня нараджэння **Алеся Салагуба**, беларускага паэта, удзельніка вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі. Загінуў у 1934 г.

**20 кастрычніка** - 510 гадоў таму (1506 г.) паны-рада ВКЛ выбралі вялікім князем літоўскім Жыгімонта Старога, княжыў да 1 красавіка 1548 г.

**20 кастрычніка** - 100 гадоў з дня нараджэння **Алеся Сучка** (1916-1993), беларускага паэта.

**25 кастрычніка** - 80 гадоў з дня нараджэння **Віктара Турава** (1936 - 31.10. 1996), кінарэжысёра, народнага артыста Беларусі.

**30 кастрычніка** - 95 гадоў таму (1921 г.) у Менску адкрыты Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

ЛІСТАПАД

**2 лістапада** - 180 гадоў з дня нараджэння **Міхала Эльвіра Андрыёлі** (1836-1893), жывапісца, ілюстратара, удзельніка паўстання 1863-1864 гг.

**4 лістапада** - 200 гадоў з дня нараджэння **Арцёма Вярыгі-Дарэўскага** (1816-1884), беларускага паэта, драматурга, публіцыста, удзельніка паўстання 1863-1864 гг.

**6 лістапада** - 125 гадоў з дня нараджэння **Іосіфа Воўк-Левановіча** (1891-1943), беларускага мовазнаўца.

**7 лістапада** - 120 гадоў з дня нараджэння **Міхася Чарота** (1896-1937), беларускага паэта, драматурга, празаіка, грамадскага дзеяча.

**10 лістапада** - 60 гадоў таму (1956 г.) адкрыты Музей абароны Берасцейскай цвердзі.

**13 лістапада** - 210 гадоў з дня нараджэння **Эміліі Плятэр** (1806-1831), беларускай фалькларысткі, удзельніцы паўстання 1830-1831 гг.

**13 лістапада - ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ.**

**14 лістапада** - 100 гадоў з дня выхаду (1916) газеты "Дзянніца" пад рэдакцыяй Цішкі Гартнага. Існавала да1917 г.

**14 лістапада** - 90 гадоў таму (1926) адбылася Акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі.

**18 лістапада** - 85 гадоў з дня нараджэння паэта **Анатоля Вярцінскага**.

**18 лістапада** - 80 гадоў таму (1936 г.) адкрыты Дом Чырвонай Арміі (цяпер Цэнтральны дом афіцэраў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь).

**18 лістапада** - 50 гадоў з дня нараджэння **Святланы Тарасавай**, беларускага літаратуразнаўца і крытыка.

**22 лістапада** - 110 гадоў таму (1906 г.) выдадзены ўказ аб выхадзе сялян з грамады - пачатак правядзення Сталыпінскай аграрнай рэформы.

**23 лістапада** - 110 гадоў таму (1906 г.) выйшаў першы нумар штотыднёвай газеты "Наша Ніва" (выдавалася да 20 жніўня 1915 г.).

**23 лістапада** - 50 гадоў з дня нараджэння **Міхася Скоблы**, беларускага паэта, журналіста.

**25 лістапада** - 80 гадоў з дня нараджэння **Івана Крэня**, кандыдата гістарычных навук, ганаровага прафесара Гарадзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.

**25 лістапада** - 70 гадоў з дня нараджэння **Аляксандры Станкевіч**, беларускага мовазнаўца, доктара філалагічных навук, прафесара.

**26 лістапада** - 125 гадоў з дня нараджэння **Янкі Станкевіча**, беларускага культурнага дзеяча, мовазнаўца, доктара славянскага мовазнаўства.

**28 лістапада** - 100 гадоў таму (1916 г.) у Вільні створаны Першы беларускі тэатр пад кіраўніцтвам Францішка Аляхновіча.

**28 лістапада** - 20 гадоў таму (1996 г.) утвораны Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь: Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі.

**29 лістапада** - 25 гадоў таму назад у Гародні створаны беларускі хор "Бацькаўшчына" (кіраўнік В.В. Кунцэвіч).

СНЕЖАНЬ

**1 снежня** - 160 гадоў з дня адкрыцця (1856) Віленскага музея старажытнасцей, заснаванага Я. Тышкевічам. Існаваў да 1914 г.

**2 снежня** - 240 гадоў з дня нараджэння **Анёла Доўгірда**, беларускага філосафа, псіхолага, педагога.

**4 снежня** - 75 гадоў з дня нараджэння **Івана Пяшко**, беларускага пісьменніка, журналіста.

**5 снежня** - 130 гадоў з дня нараджэння **Міколы Равенскага**, беларускага кампазітара.

**7 снежня** - 95 гадоў таму (1921 г.) у Заходняй Беларусі заснавана Таварыства беларускай школы (ТБШ), якое дзейнічала да 1937 г.

**8 снежня** - 25 гадоў таму (1991 г.) кіраўнікі Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Беларусь і Украіны дэнансавалі Саюзны дагавор 1922 г. і падпісалі Пагадненне аб стварэнні СНД.

**9 снежня** - 125 гадоў з дня нараджэння **Максіма Багдановіча** (1891-25.05.1917), паэта.



**11 снежня** - 140 гадоў з дня нараджэння **Мечыслава Карловіча** (1876-1909), кампазітара, дырыжора.

**15 снежня** - 95 гадоў з дня нараджэння **Сцяпана Александровіча**, беларускага пісьменніка, літаратуразнаўца, доктара філалагічных навук, прафесара.

**16 снежня** - 40 гадоў таму (1976 г.) Савет Міністраў БССР прыняў пастанову аб стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту.

**17 снежня** - 130 гадоў з дня нараджэння **Міколы Равенскага** (1886-1953), беларускага кампазітара.

**21 снежня** - 220 гадоў з дня нараджэння **Тамаша Зана** (1796-1855), беларускага паэта-рамантыка.

**25 снежня** - 125 гадоў з дня нараджэння **Уладзіслава Луцэвіч** (1891-1960), жонкі Янкі Купалы.

**27 снежня** - 180 гадоў з дня нараджэння **Валерыя Урублеўскага**, аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863-64 гг.



У 2016 годзе:

**1025 гадоў** таму (991 г.) у Полацку пачала стварацца першая хрысціянская епархія.

**950 гадоў** з часу паходу полацкага князя Усяслава Брачыславіча на Ноўгарад і захопу яго (1066 г.).

**950 гадоў** з часу пабудовы Сафійскага сабора ў Полацку (1066 г.).

**900 гадоў** з часу першага пісьмовага ўпамінання пра г. Слуцк (Случаск, пад 1116 г.).

**880 гадоў** з часу першага ўпамінання ў летапісах пра г. Крычаў (Крэчут), Слаўгарад (Прапойск) (пад 1136 г).

**855 гадоў** таму (1161 г.) полацкі майстар Лазар Богша зрабіў крыж па замове Ефрасінні Полацкай.

**770 гадоў** таму (1246 г.) князь ВКЛ Міндоўг прыняў праваслаўную веру.

**740 гадоў** з часу першага ўпамінання ў летапісах пра г. Камянец (пад 1276 г).

**700 гадоў** з часу заснавання дынастыі Гедзімінавічаў (1316 г).

**690 гадоў** таму назад адбыўся паход войска ВКЛ на чале з Давыдам Гарадзенскім на Брандэнбург і здрадніцкае забойства палкаводца.

**630 гадоў** з часу першага ўпамінання ў летапісах (пад 1386 г.) г. Дрыса (з 1962 - Верхнядзвінск).

**630 гадоў** з пачатку кіравання дынастыі Ягайлавічаў (1386 г). Кіравала Каралеўствам Польскім і ВКЛ. Спыніла сваё існаванне ў 1572 г.

**625 гадоў** з часу надання г. Гародні права на самакіраванне па Магдэбургскаму праву.

**570 гадоў** з часу стварэння Беларуска-літоўскага летапісу (1446 г.).

**530 гадоў** з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах пра м. Астравец (пад 1486 г.).

**475 гадоў** таму быў створаны паляўнічы запаведнік у Белавежскай пушчы (1541 г.).

**440 гадоў** таму г. Гародня стала рэзідэнцыяй караля польскага і вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя (1576 г.) і была ёй па працягу 10 гадоў.

**430 гадоў** таму г. Нясвіж атрымаў права на самакіраванне па Магдэбургскаму праву (1586 г.).

**420 гадоў** таму ў Вільні выдадзены "Азбука" і "Граматика словенска..." Лаўрэнція Зізанія (1596 г.).

**400 гадоў** з часу выступлення гараджан Менска і Мазыра супраць Берасцейскай царкоўнай уніі (1616 г.).

**380 гадоў** з часу атрымання г. Мсціславам права на самакіраванне па Магдэбургскаму праву (1636 г.).

**250 гадоў** з часу прыняцця соймам пастановы пра ўвядзеннеў ВКЛ адзінай сістэмы мер і вагі (1766 г.).

**240 гадоў** таму гарады і мястэчкі ўсходняй часткі Беларусі, што далучаліся да Расійскай імперыі па першым падзеле Рэчы Паспалітай, пазбаўлены права на самакіраванне па Магдэбургскаму праву (1776).

**225 гадоў** з дня нараджэння **Казіміра Чарноўскага** (1791, маёнтак Карытніца Ігуменскага р-на Менскага ваяв., цяпер Бялыніцкі р-н - 08.11.1847), аднаго з вынаходнікаў падводнага карабля (1825-1827 гг.), рэвалюцыянера.

**180 гадоў** з часу выдання царскага ўказу пра ўвядзенне ва ўсіх навучальных установах Беларусі выкладання прадметаў на рускай мове (1836 г.).

**170 гадоў** з пачатку выдання Актаў Заходняй Расіі - 5-томнага зборніка дакументаў па гісторыі Беларусі, Украіны і Літвы за XIV-XVII стст. (1846 г). Складальнікам і рэдактарам першых чатырох тамоў быў І. І. Грыгаровіч.

**150 гадоў** з часу нараджэння **Андрэя Сніткі** (1866, Вільня - 13.03.1920), археолага і краязнаўца.

**150 гадоў** з пачатку руху цягнікоў па Рыга-Арлоўскай чыгунцы на ўчастку Віцебск - Полацк - Дзвінск (1866).

**130 гадоў** з часу ўводу ў эксплуатацыю чыгуначнай лініі Лунінец - Гомель (1886 г).

**110 гадоў** з часу заснавання ў Менску мастацкай школы-студыі Янкеля Мордухавіча Кругера (1906 г.).

**110 гадоў** з часу заснавання Марцінам Кухтам (1875-1942?) прыватнай друкарні ў Вільні. Выпускала кнігі, газеты і часопісы. Друкавала газету "Наша ніва" (з 1906 г).

**60 гадоў** таму ў г. Беластоку (Польшча) заснавана Беларускае грамадска-культурнае таварыства (БГКТ), якое пачало выдаваць газету "Ніва". У Варшаўскім універсітэце створана кафедра беларускай філалогіі (1956 г.).

# Віншаванні ТБМ




***Амбасада Злучаных Штатаў Амерыкі віншуе вас з зімовымі святамі!***

*Скот М. Роланд,*

*Паверанy ў справах ЗША, Амбасада ЗША, Мінск.*



***Часовы Паверанy ў Справах Рэспублікі Польшча Міхал Хабрас разам з калектывам Пасольства Польшчы на Беларусі жадае шчаслівых, поўных сямейнага цяпла Каляд, а таксама поспехаў і дабрабыту ў надыходзячым 2016 годзе.***




***Вясёлых Калядаў і шчаслівана Новага года!***

*Амбасада Федэратыўнай Рэспублікі Германія.*




**Сябры!**

Віншуем вас з Калядамі і надыходам Новага-2016! Няхай жа адбудзецца ваш асабіты цуд, якога вы даўно чакалі!

Або закасайце рукавы і здзейсніце цуд самі - паверце, вам усё па сілах!

*Выканаўчае бюро Асамблеі НДА Беларусі.*

**Шаноўныя калегі, сябры!**

ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" шчыра віншуе вас з Божым нараджэннем і Новым годам!

Зычым радасных святаў і ўдалага 2016 года!

*Па-ранейшаму ваш БАЖ.*

**Шаноўныя калегі!**

Прыміце нашы віншаванні з надыходзячымі святамі Раства Хрыстова і Новага года.

Пакіньце у старым годзе ўсё, што не хочацца пераносіць у новы.

Няхай новы год прынясе нам з вамі шмат працы, вясёлых будняў і новых знаёмстваў.

З Новым годам, сябры!

З новым шчасцем!

*З павагай і найлепшымі пажаданнямі, суполка "Журналісты за талерантнасць".*

# Паэтка, якая марыла пра музей Ларысы Геніюш



9 студзеня зэльвенскай паэтцы **Валянціне Ададуравай** споўнілася б 75. Пражыла яна ўсяго 54. Пра паэтку і настаўніцу Елкаўскай сярэдняй школы Зэльвенскага раёна Валянціну Ададураву нагадвае сёння толькі адзіны зборнічак яе вершаў "Глыбінка", які выйшаў з друку ў Слонімскай друкарні за год да смерці паэткі - у 1994 годзе. Па сваіх светаадчуваннях, светаразуменнях, манеры думаць і гаварыць Валянціна Ададурава была найперш вясковай, сялянскай паэткай. Яе любоў да роднага краю была настолькі магутнай, усеабдымнай, што, правёўшы дзяцінства, юнацтва ў вёсцы паэтка зрабіла яе галоўным героем у сваіх паэтычных радках. Свае вершы яна прысвяціла роднай слонімскай вёсцы Хадзявічы, зэльвенскім вёскам Шавулічы, Манцякі, Ялуцавічы, Елка, Крамяніца, родным краявідам і землякам. Уся існата паэткі была ахоплена такой нястрымнай любоўю да маленькай радзімы, што нічога, апроч яе, яна проста не магла ўспрымаць:

*Гайдае рэчка тут ваду*
*Знаёмымі ўсплёскамі.*
*А я сцяжынкаю іду,*
*А я прыспешваю хаду -*
*Спаткацца з роднай вёскаю.*

Валянціну Ададурава вельмі хваляў і лёс роднай зямлі, мовы і народа, прыгажосць беларускай прыроды, пытанні маралі і міру. Пра гэта яна таксама пісала. Няўтольная прага любові да ўсяго блізкага, да гарадзенскага краю, Бацькаўшчыны, шчырых і добрых людзей гучалі ў яе мілых, адкрытых паэтычных радках. Вельмі часта перачытваю яе "Глыбінку" - зборнічак жаночых пачуццяў, захапленняў, радасці, дзе хораша апета родная зямля, якая, як магніт прыцягвала яе чуллівае сэрца. Чытаю яе вершы сёння і адчуваю, што без Беларусі ёй не было б спакою, не было б натхнення і святасці.

Паэзія, землякі і родная зямля яе лячылі, суцяшалі, а паэтка іх апявала ў сваіх вершах. Гэтыя вершы Валянціна Ададурава пакінулам нам, як напамін пра яе, як наказ, як трэба любіць бацькоўскі кут, захапляцца ім, берагчы і шанаваць яго. А яшчэ Валянціна Ададурава марыла пра музей Ларысы Геніюш у Зэльве. Яна магла б смела яго ўзначаліць, арганізаваць, быць там дырэктарам і бясконца распавядаць пра Ларысу Геніюш. Шмат сваіх радкоў паэтка прысвяціла гэтай мужнай і таленавітай сваёй зямлячцы. Валянціна Ададурава вельмі перажывала смерць Ларысы Антонаўны:

*Час веснавы,*
*а Зэльвеншчына ў скрусе…*
*Над Зэльвай цёплы*
*красавіцкі дзень.*
*Ідзем да Вас -*
*ідзем да Беларусі,*
*І верым - з вамі да яе дайдзем.*

***Барыс Баль,***

*Беларускае Радыё Рацыя,*

*Зэльвенскі раён.*

# Віншуем





Магілёўскае ТБМ імя Ф.Скарыны шчыра віншуе з юбілеем нашых даўніх сяброў Святлану Пятроўну Ксянзову і Таццяну Красоўскую. Зычым моцнага здароўя, натхнення і бадзёрасці. Без вас, дарагія спадарыні, жыццё нашай магілёўскай грамады не было б такім цікавым і прамяністым.

З Днём народзін!

# Віншуем

сяброў Салігорскай гарадской арганізацыі ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны", якія нарадзіліся 7 студзеня, з круглымі датамі:

**Анатолія Дунецкага** з 70-годдзем,

**Генадзія Масакоўскага** з 40-годдзем.

Жадаем моцнага здароўя, зямнога шчасця, доўгіх гадоў жыцця і поспехаў на шляху да нашай агульнай мэты - Вялікага нацыянальнага Адраджэння.

Сябры ТБМ.

# Ліст ахвяраванняў

сяброў Салігорскай гарадской арганізацыі ТБМ імя Ф. Скарыны, якія выкарыстаны на падпіску газеты ТБМ "Наша слова" на 1-е паўгоддзе 2016 года ў 8 школ палескай часткі Салігорскага раёна, у школу г.п. Старобіна, у гімназіі № 1, 2, 3 г. Салігорска і ў офіс Беларускага незалежнага прафсаюза на агульную суму 764 400 рублёў:

1. Мікалай Зімін - 400 000 руб.
2. Алена Калоднікава - 100 000 руб.
3. Раман Лявончык - 75 000 руб.
4. Уладзімір Масакоўскі - 115 000 руб.
5. Сяргей Чаркасаў - 75 000 руб.

*Старшыня Салігорскай гарадской арганізацыі ТБМ імя Ф. Скарыны*

*Уладзімір Масакоўскі.*

# Справаздачны даклад

## старшыні ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны" Алега Трусава аб дзейнасці арганізацыі за 2015 год

Як і заўсёды, мінулы год прайшоў для нас у штодзённай стваральнай працы на карысць нашай Бацькаўшчыны.

Жыццё не стаіць на месцы, і за гэты час адышлі ў лепшы свет актыўныя сябры і заснавальнікі ТБМ гісторык Анатоль Грыцкевіч і пісьменнік Уладзімір Содаль, актывісты ТБМ, былыя сябры Рэвізійнай камісіі ТБМ Уладзімір Кішкурна і Барыс Мускі, вязень сталінскага ГУЛАГу Аляксандр Доўбік, актывістка ТБМ з Берасця, настаўніца беларускай мовы Марыя Лукашук, галоўны рэдактар газеты "Новы час" Аляксей Кароль, старшыня Баранавіцкай арганізацыі ТБМ Віктар Сырыца і шмат іншых сяброў і прыхільнікаў роднага слова.

Зараз наша арганізацыя налічвае больш за 7000 чалавек. З іх у базе дадзеных сакратарыяту па стану на 1 студзеня 2016 г. знаходзіцца 6 тысяч 210 чалавек.

Гэты год быў для нас годам цяжкай, але стваральнай працы як у Менску, так і ў рэгіёнах нашай краіны. Найбольш актыўна працавалі рэгіянальныя актывісты Магілёва, Віцебска, Гародні, Ліды, Полацка, Баранавічаў, Гомеля, Пружанаў, Паставаў, Валожына, Асіповічаў, Фрунзенскага і Ленінскага раёнаў горада Менска, мястэчка Падсвілле Глыбоцкага р-на, Шаркаўшчыны, Оршы, Івянца і іншых. У нашы шэрагі актыўна ўступала моладзь, асабліва ў Менску. Пра нашу дзейнасць рэгулярна пісалі "Наша слова", "Новы час", "Наша ніва", "Народная воля", "Звязда", "Краязнаўчая газета" і іншыя сродкі масавай інфармацыі. Дзейнасць ТБМ таксама асвятляюць тэлеканал Белсат, радыё "Свабода", радыё "Рацыя", Еўрарадыё, партал tut.by і іншыя.

Аднак актыўнасць некаторых нашых арганізацый жадае быць лепшай. Нас хвалюе сітуацыя з дзейнасцю нашых сяброў у Берасці, Бабруйску, Пухавічах, Ваўкавыску, Клецку, Навагрудку і Мазыры.

Беларуская мова паступова вяртаецца ў выпускі навінаў, асабліва на мясцовым БТ, з'яўляюцца новыя праграмы з удзелам моладзі на беларускай мове. Быў створаны новы дзяржаўны канал "БТ-3", дзе беларуская мова актыўна прысутнічае.

З красавіка 2014 г. па чэрвень 2015 г. рэгулярна праводзіўся маніторынг моўных правоў грамадзян Беларусі. Мы накіравалі запыты аб стане моўных правоў ва ўсе 117 раённых выканаўчых камітэтаў Беларусі. Зроблены аналіз адказаў мясцовых райвыканкамаў паказвае, што большасць рашэнняў выканкамаў і пастаноў мясцовых раённых саветаў прымаецца на рускай мове. Справаводства таксама пераважна вядзецца па-руску. Атэстацыя валоданнем беларускай мовай супрацоўнікамі арганізацый дзяржаўнай улады не праводзіцца.

Беларуская мова найбольш пашырана ў сферы культуры, адукацыі і сродкаў масавай інфармацыі, а таксама ў візуальным афармленні.

У Савеце Міністраў Беларусі за вышэй азначаны перыяд па-беларуску было прынята толькі 13% пастаноў (170 з 1287) і 64 % распараджэнняў Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь (246 з 384).

Маніторынг аказвае стымулюючае дзеянне. Некаторыя органы ўзялі на сябе абавязальніцтвы па паляпшэнні сітуацыі, асабліва ў стварэнні беларускамоўных версій сайтаў.

Мы накіроўвалі запыты аб стане моўных правоў ва ўсе раённыя адміністрацыі г. Менска (9), ва ўсе ўніверсітэты і іншыя ВНУ (42), рэспубліканскія (8), абласныя (3) і гарадскія газеты (4), суды розных інстанцый (20), міністэрствы (21), камітэты (8) і іншыя дзяржаўныя структуры агульнадзяржаўнага значэння (15). Атрымана ўнікальная інфармацыя, якая патрабуе дэталёвага абагульнення. Маніторынг робіць станоўчы ўплыў на розныя дзяржаўныя структуры, якія абяцаюць пашыраць ужыванне дзяржаўнай беларускай мовы ў сваёй дзейнасці. Напрыклад, зрабіць беларускамоўныя версіі сваіх афіцыйных сайтаў. Дарэчы, з ліпеня 2014 г. сайт МЗС атрымаў сваю беларускамоўную версію, міністр замежных спраў У. У. Макей і яго намесніца А. Купчына пачалі рабіць афіцыйныя выступы па-беларуску.

У цяперашні час незалежна ад мовы навучання ва ўсіх установах агульнай сярэдняй адукацыі беларуская мова вывучаецца з першага класа, у V-XI класах на вывучэнне беларускай і рускай моў адводзіцца аднолькавая колькасць гадзін.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання вядзецца работа па прапагандзе вывучэння вучэбных прадметаў "Гісторыя Беларусі" і "Геаграфія" на беларускай мове. У выніку праведзенай работы ў 2015/2016 навучальным годзе ў г. Менску пажадалі вывучаць вучэбны прадмет "Гісторыя Беларусі" на беларускай мове 7943 вучні (у 2014/2015 - 1132), вучэбны прадмет "Геаграфія" - 1015 вучняў (у 2014/2015 - 253).

З мэтай захавання мовы як культурнай спадчыны беларускага народа ва ўстановах адукацыі арганізуюцца канферэнцыі, выставы мастацкай літаратуры, Дні і Тыдні беларускай мовы і літаратуры, алімпіяды, конкурсы, тэматычныя выхаваўчыя гадзіны; ствараюцца віртуальныя музеі і этнаграфічныя пакоі, на базе якіх праводзяцца вучэбныя заняткі, пазакласныя мерапрыемствы, экскурсіі на беларускай мове. Ва ўстановах пазашкольнага выхавання і навучання краіны працуюць гурткі, клубы і іншыя аб'яднанні вучняў, у якіх арганізавана вывучэнне гісторыі, этнаграфіі, фальклору, тапанімікі роднага краю. Так, напрыклад, толькі ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Гарадзенскай вобласці дзейнічаюць больш за 200 гурткоў па вывучэнні гісторыі Беларусі, культуры мовы і інш.

Ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі выкладаецца курс "Беларуская мова (прафесійная лексіка)". Распрацоўваюцца і выдаюцца вучэбна-метадычныя комплексы па асобных вучэбных прадметах (дысцыплінах), у тым ліку і спецыяльных. Для ажыццяўлення якаснага выкладання дысцыплін на беларускай мове арганізавана павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў (праз спецыяльныя курсы). У асобных установах вышэйшай адукацыі (звыш 20) створаны вучэбныя групы, у якіх студэнты навучаюцца на рускай і беларускай мовах. Пашыраецца колькасць спецыяльных дысцыплін, якія выкладаюцца на беларускай мове.

Факультатыўныя заняткі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі праводзяцца ў адпаведнасці з зацверджанымі Міністэрствам адукацыі праграмамі факультатыўных заняткаў. У цяперашні час на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі пры арганізацыі факультатыўных заняткаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання рэкамендуецца выкарыстоўваць праграмы факультатыўных заняткаў "Храмы, палацы і замкі Беларусі" (VII клас), "Архітэктура Беларусі" (IX клас), якія распрацаваны на беларускай мове.

Актыўна займаліся моўным маніторынгам нашыя рэгіянальныя структуры. Так, сябры ТБМ Гарадзенскай вобласці зрабілі і надрукавалі ў газеце "Наша слова" № 21 ад 27 траўня 2015 г. артыкул "Маніторынг моўнай сітуацыі на Гарадзеншчыне ад ТБМ (2014-2015 гг.). Адпаведная праца была зроблена ў Менскай вобласці, Лідзе, Менску, Салігорску, Гомелі і Паставах. У "Нашым слове" надрукаваны моўны маніторынг, які зрабілі сябры Асіповіцкай раённай арганізацыі ТБМ.

Дзякуючы нашым намаганням паступова пашыраецца выкарыстанне беларускай мовы на беларускім тэлебачанні.

Так, на тэлеканале "Беларусь 3", які з'яўляецца структурным падраздзяленнем Белтэлерадыёкампаніі, доля беларускамоўнага кантэнту ў 2015 годзе складала прыкладна 30%. У той жа час 70% уласнага кантэнту (перадачы, якія былі створаны тэлеканалам і па заказе) вырабляецца на беларускай мове. Гэта праграмы "Дыя@блог. Пра мову", "Дыя@блог. Пра літаратуру" і "Дыя@блог. P. S." "Наперад у мінулае", "Размовы пра духоўнае", "Хіт-парад "Сто песень для Беларусі", "Сіла веры", "Калейдаскоп", "Дабраранак" і "Калыханка", уся анонсная прадукцыя і большасць канцэртаў. Спецыяльна для папулярызацыі беларускай мовы створана тэлеперадача "Размаўляем па-беларуску", якая выходзіць у двух варыянтах: кароткая інфармацыйная і тэлевіктарына. Адзначым, што праект карыстаецца вялікай папулярнасцю ў тэлегледачоў.

Сябры ТБМ у розных рэгіёнах Беларусі і за яе межамі прымалі актыўны ўдзел у 8-й Агульнанацыянальнай дыктоўцы, прысвечанай памяці Францішка Багушэвіча, Рыгора Барадуліна і Генадзя Бураўкіна.

У мінулым годзе выйшлі 12 і 13 нумары часопіса "Верасень" (галоўны рэдактар Эдуард Акулін). Нумары "Верасня" актыўна распаўсюджваюцца не толькі ў Менску, але і ў іншых рэгіёнах нашай краіны, нават за яе межамі.

Актывізавалася праца курсаў па вывучэнні беларускай мовы для розных групаў насельніцтва. Праходзілі заняткі па беларускай мове, гісторыі і літаратуры для вучняў 7 - 11 класаў пад кіраўніцтвам Лявона Баршчэўскага. Увесь 2015 г. працавалі беларуска-польскія моўныя курсы пад кіраўніцтвам Людмілы Бурлевіч і Леанарды Мухінай, а таксама псіхалагічныя беларускамоўныя заняткі "Школа асобаснага росту" Людмілы Дзіцэвіч.

Летась актыўна працаваў клуб беларускага красамоўства "Прамова", кіраўнік - Аляксандр Давідовіч.

Варта адзначыць вялікі поспех курсаў "Мова нанова", заснаваных актывістамі ТБМ Глебам Лабадзенка і Алесяй Літвіноўскай. Курсы атрымалі афіцыйную рэгістрацыю, іх наведалі больш за тысячу асобаў у розных гарадах краіны, дзе працуюць філіялы гэтых курсаў.

Актыўна дзейнічае зараз гістарычная школа пад назвай "Гісторыя ў падзеях і малюнках з Алегам Трусавым" (каардынатар Алена Анісім).

Мы працягваем выпускаць "Наша слова" (наклад 2000 год) ў фармаце 8-мі палос (індэкс выдання 63865). Не гледзячы на тое, што з'яўляюцца новыя аўтары і ёсць цікавасць да публікацыі розных матэрыялаў, сітуацыя з падпіскай жадае быць лепшай. У мінулым годзе створаны адмысловы сайт газеты.

Сябры! Неабходна ўсім разам пашыраць кола падпісчыкаў. З гэтай нагоды хачу выказаць словы падзякі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, якая ў першай палове 2015 г. выдзеліла сродкі на падпіску раённых і школьных бібліятэк і музеяў краіны на беларускамоўныя выданні.

Вось ужо сёмы год кіраўнік Гарадзенскай гарадской арганізацыі прафесар Аляксей Пяткевіч з дапамогай Станіслава Судніка выдае беларускамоўны настольны перакідны краязнаўчы каляндар, заснаваны на матэрыяле Гарадзеншчыны.

У сённяшняй рэчаіснасці нам не абысціся без сталай мабільнай прысутнасці нашай арганізацыі ў інтэрнэт-прасторы. У 2012 годзе пачаў працаваць сучасны інтэрнэт-партал ТБМ. Дзякуючы яму, мы можам своечасова размяшчаць інфармацыю пра ТБМ: яе гісторыю, структуры, дзейнасць; рабіць маніторынг стану лінгвістычных правоў грамадзян і аператыўна рэагаваць на выпадкі іх парушэння; выходзіць на іншыя пласты грамадства, наўпрост незаангажаваныя ў дзейнасць нашай арганізацыі. За мінулы год партал мае 79 тысяч 789 праглядаў са ста краін свету.

Цяжкая сітуацыя па-ранейшаму ў беларускамоўнай адукацыі. Закрываюцца малакамплектныя вясковыя школы, якія працавалі на беларускай мове. Дзяцей пераводзяць у іншыя школы з рускай мовай навучання.

У канцы 2014 г. ТБМ звярнулася ў Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследванняў Рэспублікі Беларусь (далей - НЦЗіПД) з прапановай уключыць у план падрыхтоўкі законапраектаў на 2015 г. распрацаваны ТБМ законапраект "Аб дзяржаўнай падтрымцы беларускай мовы". У прыватнасці, заключныя палажэнні гэтага законапраекту прадугледжваюць пераклад асноўных нарматыўных прававых актаў на беларускую мову. У адмове НЦЗіПД уключыць законапраект у план падрыхтоўкі на 2015 г. выказана меркаванне, што адсутнасць заканадаўча замацаванага абавязку ўжывання ва ўсіх сферах грамадскіх адносін адначасова дзвюх дзяржаўных моў не з'яўляецца падставай для дыскрымінацыйнага падыходу ў выкарыстанні беларускай мовы. Разам з тым, у тым жа адказе НЦЗіПД канстатаваў, што колькасць дзейсных нарматыўных прававых актаў на рускай мове складае больш за 33 300 (апрача тэхнічных нарматыўных прававых актаў, міжнародна-прававых актаў Рэспублікі Беларусь), чым, на наш погляд, засведчыў супярэчлівасць уласных разважанняў.

Падрабязная інфармацыя аб ужыванні беларускай мовы ў судовай сістэме Беларусі размешчана на нашым сайце.

Па замове ТБМ было зроблена 8 відэафільмаў: адзін з іх пра новыя тактыкі для распаўсюджвання шматмоўя, у той час як яшчэ адзін - аб моўных правах у царкве. Сярод іх - "Змагары за мову", "Анталогія русіфікацыі", "Культура і бізнэс" і "Беларуская мова ў рэкламе".

Разам з ГА "Згуртаванне беларусаў свету Бацькаўшчына" знята 9 відэафільмаў. Дыяпазон з самых наведвальных беларускіх вэб-старонак падтрымлівае гэтую серыю. Яны дэманструюцца на трох абвешчаных вэб-старонках і YouTube, і яшчэ на 20 іншых вэб-старонках. Тысячы людзей ужо прагледзелі іх. Некаторыя з іх адправілі нам лісты, якія прапануюць дапамогу ў здымках новых эпізодаў ў іх населеных пунктах.

Кожны з фільмаў распавядае пра нейкае беларускае паселішча, падаючы інфармацыю аб яго назве, гісторыі, культуры, і г. д. Мэта гэтай дзейнасці заключаецца ў наступным: відэасюжэты забяспечваюць права народа на атрыманне інфармацыі на роднай мове. Яны папулярызуюць беларускую мову, беларускія геаграфічныя назвы, культуру і гісторыю. Некаторыя з гэтых відэа прадстаўляюць Беларусь як краіну з традыцыямі моўнай разнастайнасці і цярпімасці.

Навукова-папулярныя сюжэты маюць працягласць каля 10 хвілін. Гэтая відэасерыя стала працягам папулярнага праекту "Kraj-By".

Ангельская версія нашага партала рэгулярна абнаўляецца. Была створана асобная старонка з артыкуламі па інавацыйных тактыках абароны моўных правоў. Гэтыя артыкулы былі апублікаваныя ў некалькіх друкаваных выданнях і прынеслі плён, напрыклад, Міністэрства культуры папярэдне ўхваліла ідэю музея мовы.

Створана 7 новых вэб-старонак для мясцовых структур ТБМ: у Менскай вобласці (в. Мікулічы, г. Салігорск, Бярэзінскі раён), у г. Менску (Савецкі раён), у Віцебскай вобласці (г. п. Шаркаўшчына, г. п. Бешанковічы і г. Паставы) і ў Берасцейскай вобласці (г. Пінск і Пінскі раён).

28 сакавіка 2015 г. у Менску адбылася Міжнародная канферэнцыя "Моўныя правы і іх абарона". Былі запрошаныя праваабаронцы і навукоўцы з Беларусі, Літвы, Украіны, Польшчы, Расіі, Эстоніі. Сярод беларускіх удзельнікаў праваабаронцы з праваабарончага цэнтра "Вясна", навукоўцы з НАН Беларусі, вядучых універсітэтаў краіны.

Было праведзена пленарнае паседжанне і 2 секцыі. У канферэнцыі прынялі ўдзел звыш 50 удзельнікаў. Інфармацыя пра канферэнцыю была апублікаваная ў "Свободных новостях плюс", у "Нашым слове", на Еўрарадыё, ва ўкраінскіх СМІ.

*(Заканч. на стар. 6.)*

# Справаздачны даклад

### старшыні ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны" Алега Трусава аб дзейнасці арганізацыі за 2015 год

*(Заканчэнне. Пачатак на ст.5.)*

Па выніках канферэнцыі ў чэрвені 2015 г. быў надрукаваны зборнік (у дзвюх частках). Гэта каштоўная крыніца інфармацыі для навукоўцаў і абаронцаў моўных правоў. Экземпляры матэрыялаў канферэнцыі былі перададзены ў бібліятэкі і навуковыя асяродкі Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Англіі, Германіі.

Для рэкламы сваёй дзейнасці мы надрукавалі каляровы буклет разам з календаром у колькасці 1600 асобнікаў.

Буклеты распаўсюджаны ў Менску, у Баранавічах, Слуцку, Салігорску, Лідзе, Гомелі і за мяжой (у Літве, Украіне, Польшчы і Расіі). Зроблена і англамоўная версія буклета.

Сакратарыят ТБМ у мінулым годзе накіраваў усім кандыдатам у прэзідэнты прапановы па паляпшэнні стану беларускай мовы ў краіне, каб яны ўключалі адпаведны пункт у свае прадвыбарчыя праграмы. Трэба адзначыць, што сп. Таццяна Караткевіч нашы прапановы ўключыла ў сваю праграму са спасылкай на нашу арганізацыю.

Актыўна займаюцца краязнаўчай і турыстычнай працай нашы сябры з Гародні, Магілёва, Паставаў, Шклова, Баранавічаў, Шаркаўшчыны, Магілёва і Ліды. Яны ладзяць беларускамоўныя экскурсіі, пленэры, канферэнцыі і семінары. У гэтым плане хочацца адзначыць сяброў Рады ТБМ Станіслава Судніка, Алега Дзьячкова, Алеся Кроя.

Улічваючы інфляцыю, Рада ТБМ прыняла рашэнне з 1 студзеня 2016 г. павялічыць памер сяброўскіх складак. Трэба адзначыць, што большасць суполак ТБМ своечасова здалі складкі, а таксама сабралі немалыя ахвяраванні. Па стану на 31 снежня 2015 г. на нашым рахунку было 20 мільёнаў 667 тысяч беларускіх рублёў..

Адбыліся змены ў рэгіянальным кіраўніцтве ТБМ. Абраныя новыя кіраўнікі ў Гомелі, у Баранавічах і некаторых раённых арганізацый у Менску. У мінулым годзе былі выдадзены насценныя і кішэнныя календары і паштоўкі, прысвечаныя Францішку Багушэвічу, Генадзю Бураўкіну і Кастусю Тарасаву. Прыгожы настольны каляндар выдала Лідская арганізацыя ТБМ.

Дзякуючы супрацоўніцтву з кампаніяй "Новы паварот" выйшаў новы дыск з заданнямі і каментарамі на беларускай мове для здачы экзамена на правы кіроўцаў.

Напрыканцы 2015 г. па ініцыятыве ТБМ быў створаны аргкамітэт па стварэнні Нацыянальнага ўніверсітэта з беларускай мовай навучання, у які ўвайшлі прадстаўнікі розных палітычных і грамадскіх арганізацый. Сустаршынямі аргкамітэта абраны сп. Аляксандр Мілінкевіч, Уладзімір Колас і Алег Трусаў.

Шаноўнае спадарства!

У новым годзе нас чакае шмат розных спраў.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на правядзенне выбараў у беларускі парламент у верасні гэтага года. Было б добры, каб сябры ТБМ прынялі актыўны ўдзел у гэтай кампаніі з мэтай папулярызацыі беларускай мовы і прапанавалі праводзіць парламенцкую кампанію на беларускай мове. Таксама трэба прапанаваць кандыдатам уключыць у свае праграмы наступныя пункты:

1. Беларускі парламент павінен працаваць на беларускай мове, г.зн. усе законы рыхтуюцца і прымаюцца на дзяржаўнай беларускай мове.

2. Унесці неабходныя змены ў Закон аб мовах Рэспублікі Беларусь.

3. Прыняць закон аб дзяржаўнай падтрымцы беларускай мовы.

Жадаем вам моцнага здароўя, духоўнай моцы і аптымізму.

Дзякуй вам усім за актыўную працу на карысць беларускай мовы і нашай Бацькаўшчыны.

Жыве наша мова і жыве Беларусь!

Старшыня ТБМ Алег Трусаў.

# Тут любяць і чакаюць ветэранаў

5 студзеня ў Бараўлянах адбылася канферэнцыя "70-годдзе стварэння Рэспублікан-скага шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны імя П.М. Машэрава. Гісторыя. Сучаснасць. Перспектывы".

На святкаванне юбілею шпіталя сабраўся ўвесь лячэбны калектыў бальніцы, дактары з іншых устаноў аховы здароўя краіны, ветэраны вайны, дзеячы культуры і мастацтва. Актыўны удзел ў святкаванні ўзяў Бараўлянскі се-



льсавет. На ўрачыстасць прыбыў міністр аховы здароўя Васіль Жарко. Прэзідэнт А. Лукашэнка накіраваў віншавальны адрас калектыву шпіталя.

З гісторыяй стварэння лячэбніцы можна азнаёміцца ў музеі, дзе захоўваюцца альбомы з фотаздымкамі, газетныя вытрымкі, хірургічныя інструменты часоў Вялікай Айчыннай вайны, партрэты загадчыкаў гэтай слыннай медычнай установы з 1946 па 2015 год. Першым галоўным лекарам шпіталя інвалідаў вайны ў 1946 годзе быў прызначаны Усевалад Леанідавіч Інгіз.

Зараз яго ачольвае Віктар Барысавіч Лішакоў.

- У нас значная колькасць лекараў працуе больш за 30 гадоў і добра ведаюць падыход да хворых, траўмаваных целам і душой людзей, - заўважыў намеснік галоўнага лекара па арганізацыйнай і медыцынскай працы Аляксандр Вальчук. - Сярод іх: загадчык неўралагічнага аддзялення Піліп Піліпавіч Гурскі, загадчыца тэрапеўтычнага аддзялення № 1 Наталля Аляксандраўна Ляпешка і іншыя.

Наталля Аляксандраўна працуе ў шпіталі з 1986 года, пасля медынстытута і ардынатуры. Яна прайшла спецыялізацыю па кардыялогіі і тэрапіі.

- Мы імкнемся больш размаўляць з нашымі ветэранамі, ваярамі, былымі вязнямі. У кожнага з іх былі свае душэўныя раны, пакуты, іх трэба выслухаць, усё спакойна ім патлумачыць, ставіцца да іх цярпліва, спагадліва. Яны прыбываюць да нас са ўсёй Беларусі, але, пераважна з Гарадзенскай і Менскай абласцей. Калі прызвычаюцца, то прыязджаюць па некалькі разоў, просяцца да тых жа самых дактароў, бо ведаюць, што мы іх добра сустракаем. З гадамі мы пачынаем ставіцца да іх як да сваіх родных.

- Абавязкова пазначце, што шпіталь адзначаецца вельмі добрым стаўленнем да хворых,





- сказаў 83-гадовы Якаў Фёдаравіч Тарасаў, удзельнік партызанскага руху. - Нас добра лечаць і даюць нам гарантыю яшчэ на некалькі гадоў, каб мы выканалі ўсё, што задумалі ў жыцці!

Неаднаразова прыязджаў у Бараўлянскі шпіталь на лячэнне сябар Рады ТБМ, пісьменнік Уладзімір Ілліч Содаль, прымаў кропельніцы з дапамогай руплівых медсястрычак, хадзіў на працэдуры, гуляў па лесе. Ён з цікавасцю распытваў сваіх суседзяў па палаце і аддзяленні, былых вязняў канцлагераў, ваяроў-інтэрнацыяналістаў, запісваў іх жыццёвыя гісторыі, дарыў свае кнігі і распавядаў ім пра Францішка Багушэвіча і Янку Купалу.

*Эла Дзвінская,*

**На фота аўтара:**

1. Загадчыца 1-ага тэрапеўтычнага аддзялення шпіталя Н.А. Ляпешка.

2. Якаў Фёдаравіч Тарасаў і Наталля Аляксандраўна Ляпешка.

3. У музеі шпіталя.

# Прэзентацыя Гарадзенскага краязнаўчага календара ў Лідзе

5 студзеня ў Лідскай цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшоў круглы стол "Краязнаўчая дзейнасць газеты "Наша слова"".

Асновай імпрэзы стала прэзентацыя нядаўна выйшаўшага "Беларускага настольнага перакіднога календара на 2016 год на матэрыяле Гродзеншчыны". Укладальнік календара - сябар рэдкалегіі газеты "Наша слова" прафесар Аляксей Пяткевіч. Рэдактар календара - рэдактар газеты "Наша слова" Станіслаў Суднік.

Сёлетні каляндар - гэта сёмы выпуск, і ўсе выпускі рабіліся тым жа калектывам. Першыя календары да канца рабіліся ў Лідзе. Пазней у Лідзе пачаў рабіцца макет календара, а друк ужо робіцца ў Гародні.



При афармленні календара выкарыстоўваліся розныя элементы: партрэты знакамітых людзей, храмы Гарадзеншчыны, гербы населеных пунктаў і г.д. У сёлетнім календары скарыстаны беларускі арнамент (адпаведна 13 арнаментальных узораў).



БЕЛАРУСКІ НАСТОЛЬНЫ ПЕРАКІДНЫ КРАЯЗНАЎЧЫ КАЛЯНДАР

НА 2016 ГОД

(на матэрыяле Гродзеншчыны)

*Складальнік А. Пяткевіч*
*Рэдактар С. Суднік*

Гродна 2015

У Лідзе календары ўжо перададзены ў аддзел адукацыі, ідэалагічны аддзел, пяць асобнікаў падчас "круглага стала" былі перададзены ў бібліятэкі горада. Дарэчы ў Лідскай цэнтральнай раённай бібліятэцы гэты каляндар знаходзіцца ў фондах бібліятэкі, пачынаючы з першага выпуску. Каляндар знаходзіцца і ў фондах Лідскага гістарычна-мастацкага музея, куды будзе перададзены і сёлетні.

Як было адзначана падчас імпрэзы значэнне выдання Гарадзенскага календара выходзіць далёка за межы Гарадзенскай вобласці. Гарадзенскі каляндар і каляндар"Родны край" - два асноўныя беларускія штодзённыя календары. Да іх дадаюцца календары юбілейных і памятных датаў розных выданняў, у тым ліку і газеты "Наша слова", дадаецца "Беларускі народны каляндар, які таксама выдаюць розныя выданні, у тым ліку "Наша слова", "Звязда" і інш. У выніку атрымліваецца грунтоўная нацыянальная база звестак-арыенціраў, якія пачынаюць выкарыстоўваць у розных галінах нашага жыцця, перш за ўсё ў яго гуманітарнай сферы.

На імпрэзе было выказана пажаданне выдаваць Лідскі каляндар. Магчыма, гэта і рэалізуецца. Прынамсі, у 2015 годзе быў выдадзены настольны каляндар на 2016 год, прысвечаны 425-м угодкам надання гораду Лідзе Магдэбургскага права. За год да таго ў Лідзе выдаваўся каляндар ТБМ, макет якога тут і рабіўся, таму досвед выдання любога календара ў Лідзе ёсць, і пытанне, відаць, упрэцца ў фінансавы бок справы.

Вёў круглы стол рэдактар газеты "Наша слова" Станіслаў Суднік, дапамагала галоўны бібліёграф бібліятэкі Галіна Курбыка.

Падчас наступнага "круглага стала" 12 студзеня адбудзецца прэзентацыя зборніка канферэнцыі ТБМ.

*Яраслаў Грынкевіч.*

*(Працяг. Пачатак у папярэднім нумары.)*

Вы абодва і я маленькія кропкі ў Гэтым свеце, нам трэба сумленна (!) рабіць сваю працу, выконваць наканаванне, а не пішчаць пра веды/няведы, мажлівасці. У мяне аўто і дачы ніколі не было, няма, мусіць, не будзе, дык што - нізіцца перад кожным у выпрошваннях: надрукуйце, калі ласка.

4. Выконваю я абавязак. Нават калі пішу гэтае заслужанае вамі ветлівенькае пісьмо… Свой абавязак годна павінны выконваць кожны, не чакаць пугі ад начальства ці неба. Вы выконваеце? Грэшыце!

5. Усё жыццё за любую крытычную заўвагу да самога ці літтвора шчыра ўдзячуся любому, улічваю. Хачу сёння, паверце, хачу згаджацца з заўвагамі паважанага пана Андрэ Фэ. Не магу.

6. Перайду да канкрэтыкі, праўды/няпраўды рэдактара.

**Дэталізацыя, разбор часопісных заўваг**

1. *Бык Буганера паміраў. Рыжыя і чырвоныя палосы на задыханых баках утомленага прыгажуна ўжо не цяклі са спіны долу, не сачыліся рэдкімі кроплямі на ўзрыхлены пясок, - кроў запяклася на хібе і баках жывёлы.*[1]

Рыжыя - няправільна, лепш рудыя.

Палосы на задыханых баках... - няправільна, трэба з бакоў.

Ужо не цяклі - няправільна, палосы не цякуць.

Не сачыліся - няправільна, палосы не сочацца.

Узрыхлены пясок - няправільна.

На хібе і баках жывёлы - няправільна, трэба на хібе і на баках жывёлы; ды й наогул хіба ў быка няма, хіб у свінні.

**Адказ.** Рыжыя і рудыя - не адно і тое. Аўтар напісаў рыжыя, не трэба яго правіць. Японцы ў чырвоным колеры розняць 16 адценняў.

Кроў запяклася на баках, ужо не цячэ. Як цякла хвілін колькі назад. Ручай і рака - таксама паласа, вадзяная. Раны ад бандэрылляў і ўдараў пікадора глыбокія, кроў цякла палосамі, прынамсі так здавалася з трыбуны. Пасля не цячэ і не капае, бо запяклася на шэрсці.

Трэба бачыць моцна ўзрыхлены капытамі пясок арэны пасля кожнага карыднага бою. Яго раўняюць на вачах тысячаў гледачоў некалькі чалавек.

Хіб у свінні - правільная заўвага. У быка, казы, ваўка, сабакі таксама хіб. Нават у рыбы, паводле асобных беларускіх аўтараў. Варта пачытваць пану Фэ не толькі напаўграматных у карыдных баталіях вікіпедаўцаў, а і славянскія слоўнікі, асабліва тлумачальныя.

2. *Заканчвалася бітва. Зусім нядаўна вялікія прыгожыя, а цяпер то маленькія невыразныя, то вырачаныя зяркастыя вочы быка пагасалі, з нязлосным зодумам пазіралі на сваіх катаў.*

Заканчвалася бітва - няправільна, трэба закончылася.

Вырачаныя зяркастыя вочы быка пагасалі, з нязлосным зодумам пазіралі - няправільна, трэба зяркастыя зняць, пагасалі замяніць на патухалі, з нязлосным зодумам замяніць на нязлосна.

**Адказ**. Бітва не закончылася, толькі пачынаецца, нельга пісьменніку Андрэ Фэ заканчваць аповесць на першай старонцы.

Не вучыце аўтара апісваць вочы быка і перажыванні ў перадсмяроцці.

Пагасалі і патухалі не адно і тое.

3. *Не бунтаваў ужо Буганера, не кідаўся ў лютасці на праклятае чырвонае палотнішча, не цаляў рогам у засыўна няўлоўнага матадора і яго памочнікаў. Бык слухаў абуджаны ўнутры паток іскраў і ведаў, зараз адбудзецца штосьці вялікае і непапраўнае, такое агромністае, што ягоны боль, парывы да помсты, прага супакою і задавальненняў - усё раптам стала мізэрным, пошасцю перад блізкім дзіўным ператварэннем, - бык страшыўся, што паток шугоўных іскраў усярэдку перастане бруіцца. Замрэ аслабелы, з кожным імгненнем танчэйшы ручаёк - і тады здарыцца непапраўнае.*

Пакінуць адну першую фразу. Астатнія сем радкоў варта зняць. Нічога падобнага бык не думае.

Ён не можа слухаць абуджаны ўнутры паток іскраў, не можа ведаць. Увогуле, як гэта зразумець - паток шугоўных іскраў усярэдку перастане бруіцца.

**Адказ.** Што аўтару выкідаць з тэксту - не праўшчыку раіць, вучыш - аргументуйся, не можаш - не лезь.

Адчуванае і думанае забіваным быком не рэдактарам Фэ вызначаць, тым болей крэсліць.

4. *Навізна новага пачуцця неўзабаве перастала палохаць быка, не была пастрахотнай, як мроілася хвіліну таму.*

Фразу абавязкова трэба зняць.

**Адказ.** Паўтараюся, не Андрэ Фэ вызначаць фразы для выкідонства, няхай сваіх герояў пасе, парадчыць толкам не адно шэранькія тэксты, а і думкі герояў, паводзіны.

5. *Аляксей Бялько не варушыўся. Блізкая смерць быка, сапраўднага звера ў бітве, свядомае забойства аднаго з найлепшых стварэнняў прыроды, забойства пад воплескі азвярэлых людзей скаланула беларускага доктара.*

...аднаго з найлепшых стварэнняў прыроды... - зусім няправільна. Карова, птушка і конь таксама прыгожыя.

**Адказ.** Кожная істота прыроды па-свойму дасканалая, кожная. Растрывожанаму ўпершыню бачаным доктару ў тыя хвіліны самым прыгожым падаваўся адчаюга бык, гераічны змагар за існаванне з чалавечаю подласцю. Усё правільна.

6. *Агідна ў яго на душы. Мярзотніцтва людзей не мае мяжы. Забіваць на пацеху тупым і сытым, абыякавым, якія не ведаюць дзе падзяваць час, але прагнуць усё новых казытных адчуванняў, дабраслявяць забойства дзеля ўласнай весялосці, забойства на вачах ва ўсіх, дарослых і малых... Роспачна тэрапеўту Аляксею Бялько.*

Падзяваць, казытных - што за словы, абавязкова замяніць.

**Адказ.** Аўтар выкарыстоўвае, ужывае, прымяняе сваю лексіку. Яна багацейшая і прыгожшая за лексікон пана Фэ.

7. *Гэтаксама было на сэрцы ў часе пажару Слуцкага суда, пры леташнім перазахаванні ўвойну загінулых байцоў. Твар доктара моршчыцца.*

Абедзве фразы нягодныя. Пры чым тут суд і вайна.

**Адказ.** У найузрушную хвіліну ўзгадваецца ўзрушнае. Аляксею Бялько - спальванне Слуцкага суда і перазахоўванні загінулых савецкіх байцоў. Не аглабельшчыку і выдзіру Андрэ Фэ ўкладваць ў галаву героя іншыя паняцці. Нічога знімаць не трэба.

8. *Бык супыніўся ў цэнтры арэны, раздумвае.*

Бык раздумвае? Пра што?

**Адказ.** Бык раздумвае пра розум таленавітага рэдактара, хітраванства выкручванняў пана Андрэ.

9. *Матадор Антоніо Ламеллі ціхенька, каб хто на арэне і ў глядацкіх радах не ўчуў і не заўважыў, папрасіў быка не супраціўляцца смерці.*

Чаго не заўважыў?

**Адказ.** Адна з найважных умоваў карыды - феерычнасць, лёгкасць, фатумнасць. Усе карыдаўцы імкнуцца ўтаіць уласныя пострахі, страхавітыя шэпты да быка. Што павінны заўважыць матадор у крытычную хвіліну? Не стаў блазенскія пытанні, не сцябай сябе.

10. *- Падай, Буганера, падай, не цягні, - умелы прыгожы матадор ад быка за пяць метраў.*

На такім пабоішчы прыгожым матадор быць не можа.

**Адказ.** Усе матадоры як правіла прыгожыя знешне, гэтага не адняць. Дарадцам не варта лезці з павукаю куды не просяць.

11. *Спрытны Ламеллі заслужана чакаў заслужанай развязкі. Сыграй сваю ролю, бык, да канца, не супраціўляйся зыходу, падай.*

Спрытны, заслужана, заслужанай, зыходу неабходна замяніць, не да месца.

**Адказ.** Тое самае. Мяняй Андрэ Фэ ва ўласных тэкстах словы, не ў чужых.

12. *Буганера пачуў шэпат матадора, зразумеў покліч ягонай душы - і застаўся на месцы, натапыраны, знерухлівы. Нават забыў, каму належыць такое прыгожае імя. Звер баяўся скрануцца хоць трошкі; сноп іскраў замрэ; невядомая, таму і жудасная пасілка туману абвалачэ поўнасцю, пацягне за сабою ў неагляднасць, ужо звабную, нястрашную, хаця нежаданую.*

Звер не можа ўчуць покліч душы матадора. Знерухлівы, поўнасцю, неагляднасць, звабную неабходна замяніць, гэтыя словы не зразумее чытач.

**Адказ.** Пeратасоўвай у сваіх тэкстах словы і фразы. Аўтар і бык не могуць зразумець тупую бяздарнасць пытанняў і падкрэсліванняў рэдактара Андрэ Фэ.

13. *Пальцы Аляксея Бялько камячылі, сціснулі нядаўна такую каштоўную праграму карыды, вочы неадрыўна сачылі за рухамі карыднікаў на арэне. Мярзотнікі катуюць безабаронную жывёлу...*

Камячылі няправільна, трэба камечылі. Нядаўна такую каштоўную выкінуць, лішніца. Карыднікаў - грубая памылка аўтара, трэба пісаць адзін карыднік.

**Адказ**. Можна камячылі і камечылі. Навошта правільнае правіць на правільнае, паказваць лішняе прыдзірства.

На карыдзе шэсць матадораў, у кожнага свая квадрыга, куадрылля. Сказаць на арэне адзін карыднік - раўназначна адзін футбаліст на стадыёне. Разумею, прабачаю неспецыялісту адсутнасць прафесійных ведаў... калі ён не навязвае ўласную цемрасць іншаму чалавеку. Выбачаюць прагнаму да вучобы, астатніх тыкаюць носам у іх няпраўду, выпростваюць. Іначай грамадства скоціцца ў яр усярэдненасці, павярхоўнасці, невуцтва.

14. *Першая хваля абурэння выклікала другую абуральную хвалю, трыста новых хваляў. Сярод саракапяцітысячных глядацкіх воплескаў не раздасца воплескаў Аляксея Бялько. Славутая арэна карыды ў славутым дзевятнаццацімільённым горадзе Мехіка сатрасаецца ад радаснага гулу, воклічаў, але была б яго ўлада, ён разагнаў бы карыдную шайку-лейку.*

Абуральную хвалю, трыста новых хваляў, саракапяцітысячных глядацкіх воплескаў, карыдную шайку-лейку - не зразумела пану Андрэ Фэ, замяніць.

У кожнага гледача ўсяго дзве рукі.

**Адказ.** З той жа оперы: мне думаецца, хацелася б, а чаму б не замяніць такое слова на другое.

Пры чым тут дзве рукі ў гледача.

15. *Не катуйце жывёлу, не чыніце болю любой часціцы жывой ці нежывой прыроды. Пашкадуйце нават драпежніка, разумнаму высокасцю неба і прыродай наканавана шкадаваць усё існае.*

Часціцы жывой ці нежывой прыроды - не зразумела.

**Адказ**. Мы чытаем пра зварку металаў у космасе, не лезем да аўтара па растлумачэнні. Не разумееш часціцы жывой і нежывой прыроды - і не лезь па тлумачэнне.

16. *- Шлехт. Аллес матадорэн - думпкопф, - непадалёк падняліся двое зграбных немцаў, ён і яна высокаінтэлігентна пакідалі грубае відовішча грубых людзей.*

Зграбных немцаў, высокаінтэлігентна, грубае, грубых - замяніць.

17. *Яны першы раз глядзяць карыду, таксама абураюцца. У Аляксея Бялько парыў - падняцца за мілаю параю, хутчэй прабірацца на выхад, балазе ніхто не замінае на праходзе, зніклі і надакучлівыя прадаўцы цукерак, піражных.*

Мілаю параю - замяніць.

18. *Прыроджаная цікаўнасць і выліковасць ураджэнца шматгаротнай цярплівай беларускай вёскі не дазволілі доктару зрабіць прыгожы ўчынак - пакінуць карыду, зняважыць велізарны калектыў гледачоў непахісным рашэннем. Аляксей Бялько застаўся на месцы.*

Прыроджаная цікаўнасць і выліковасць, прыгожы, зняважыць велізарны калектыў гледачоў непахісным рашэннем - усё не да месца.

А як жа трыста хваляў абурэння?

19. *Іскроўны ручаёк, адчуў Буганера, перастаў шугаць уверх, пацёк убок і ўніз, вось-вось неглыбокія ночаўкі з цяпельцам перавернуцца - і схамянуўся. Выпрастаў падагнутую было нагу.*

Іскроўны ручаёк, пацёк убок і ўніз, неглыбокія ночаўкі з цяпельцам перавернуцца - словы яўна не да месца, думка няясная.

**Адказы 16-19.** З той жа оперы, парады замяніць словы. У аўтара нармальнае беларускае слова, не чапай яго, пане рэдактар.

У героя аповесці за дзень тысяча думак, у пана Фэ, безумоўна, болей. Доктар Бялько справядліва пратэставаў супраць забойства прыгожай дужай істоты; зачараваны майстэрствам карыдаўцаў, узвышанасцю падзеяў, захоплены ўсплёскамі радасці шматтысячных гледачоў сам зачараваўся карыдаю. Што тут няправільнага?

Няясную думку героя/аўтара распетрыць чытач, жвачка яму апрыкрала.

Допіс пана А. Ф. а як жа трыста хваляў абурэння? яркае сведчанне ягонай няўмеласці, бяздумства, абсалютнай літаратурнай слабасці.

Гэта выняткі ўсяго з першых старонак, першых ў аповесці, праўленых "высокім" мексіканскім прафесіяналам панам Андрэ Фэ (не забудзем, праўкі і заўвагі яго ўхваліў кіраўнік).

Не мне меркаваць, чаго тут болей - рэдактарскага няўмельства, прыдзіркаў, непавагі панам А.Ф. самога сябе, упэўненасць у беспакаранасці. Меркаваў, што аўтар пасаромеецца выказаць чытачам, уладцам, пісьменнікам уласнае няўменне... Забыў крытык правіла: не ведаеш - не вучы, сумняваешся - не настойвай. Думаў, прамаўчыць аўтар - і ўсё сыйдзе ў патайнасць, звычную літаратурную сумятнечу, крыўдачкі.

Каб нявопытнаму чытачу падкрэсліванні, пытанні, замены слоў, выкідонства фраз не здаліся справядлівымі, мушу, проста абавязаны патлумачыцца па абсалютна кожнай заўвазе пана А.Ф. Для яго карысці і, галоўнае, для маладых аўтараў. Трапіць маладзён у рукі зацыкленага, абмежаванага ведамі і практыкай рэдактара - і можа разгубіцца.

Нявопытны не асмеліцца словам засупярэчыць упэўненаму часопіснаму, выдавецкаму камлытніку.

Старонкі пакрэмзанага панам А.Ф. тэксту - узор літаратурнага самаедства - мушу захаваць. Надоўга. Як захоўваю выстарванні многіх ранейшых літгаблёўшчыкаў.

Такім чынам, я паказаў абсалютна ўсе праўкі і падкрэсліванні на аповесці, коратка выказваю нязгоду з імі. Няхай вопытны і нявопытны чытач сам ацэніць адбылае.

Амаль у кожнай літканторцы па-ранейшаму імкнуцца вучыць, маладога і вопытнага. Падказаць новы літход, ліквідаваць промах, агрэх - гэта апраўдана, заўжды было і будзе, але беларускія грамацеі і мексіканскія пнуцца школіць. Асабліва даюць адлупы навізне - няўгоднаму сюжэту, прыёму, дыялекту.

Абавязаны ўзгадаць колькі фраз з ужо мной надрукаванага.

*"Единственный в русской литературе язык Чехова при наших современных ограничителях не появился бы,* - казаў Аляксандр Купрын. - *Запас слов у него* (Чэхава) *необычайно громаден"*. Ён жа маладым пісьменнікам раіў: *"Найди образные незатасканные слова - лучше всего неожиданные"*.

Разумею, няма шляхаводцаў (путейцев) мовы, сцвярджаў славуты рэфарматар рускай мовы і літаратурных стыляў Уладзімір Хлебнікаў.

*(Працяг у наст. нумары.)*

[1] Курсіў - тэкст аповесці, арыгінал, пад ім заўвагі і праўкі старанніка пана Андрэ Фэ, далей адказы аўтара.



# Граф Бандынэлі - забыты паэт

**Ваўкалака**

Чараўніца ўракла:
Быў я калісь ваўкалакам,
Бегаў чортам ўздоўж сяла;
І к гавядам поўзаў ракам,
І людскую знаў гаворку,
І з сабакамі з надворку
Гаварыць я спосаб меў.
За гумном раз ціха сеў,
Ажно Лыска прыляцеў,
Як на панскай службе стаў,
Па прыязні ён мне кажа:
"Кінь ты, куме, жытло ўражжа:
Цяпер марна прападаеш,
А ты ж гэткі спосаб знаеш:
Майму пану стань служыць,
Табе добра будзе быць."
"А ты дурню, думаў я:
Мне вярнуцца да сяла?
З сваім панам і сялом
Задушыся ты калом,
Хоць галодзен - я свабодзен,
Гдзе мне цягне - там бягу,
На свабодзе прападу,
А ў няволю - не пайду!
Буду вольным ваўкалакам ,
Ты ж - на прывязі сабакам!"

*Альгерд Абуховіч,*
*1860-1861 гг.*



У магілёўскага ТБМ ёсць даўняя краязнаўчая завядзёнка наведваць цікавыя мясціны нашай Беларусі. Вандруем па родных мясцінах на вялікіх аўтобусах, цягніках і легкавіках.

21 лістапада 2015 года мы з магілёўскімі сябрамі, аматарамі краязнаўства, селі на легкавік і паехалі па мясцінах Бабруйшчыны, Глушчыны і Случчыны. Асноўнай нашай мэтай было наведаць родныя мясціны нашага слыннага земляка Альгерда Абуховіча-Бандынэлі, 175 год з дня нарадзін якога адзначалася ў 2015 годзе.

Спачатку мы заехалі ў мястэчка Гарадок Глускага раёна, дзе наведалі драўляную праваслаўную царкву 19 ст. Казьмы і Дзям'яна. У 1887 г. у Гарадку нарадзіўся Цодзік Славін, які ў 1924 заснаваў у Бабруйску краязнаўчы музей. Бараніў помнікі горада і ў 30-х стаў ахвярай рэпрэсій.

Калі мы завіталі ў Калацічы, што знаходзіцца за некалькі кіламетраў ад Глуска, адразу накіраваліся ў мясцовы дом культуры. Ля ўваходу ў будынак месціцца невялікі помнік паэту-земляку, што надало нам большага натхнення на пошукі. Але супрацоўнікі мясцовай установы культуры нас дужа засмуцілі, бо сказалі, што нічога пра А. Абуховіча не ведаюць. Не губляючы надзеі, мы накіраваліся на пошукі старажылаў, і нам пашанцавала - мясцовы жыхар 1924 года нараджэння Васіль Глаз распавёў, дзе трэба шукаць падмуркі "панскага маёнтка". З даўнішніх панскіх маёнткаў мясцовы жыхар прыгадаў тры мясціны, і мы вызначылі тую, дзе раней была сядзіба Абуховічаў. Панскія пакоі стаялі яшчэ да 1948-1950 гадоў. Гэта быў вялікі драўляны будынак, дзе падчас вайны размяшчаўся гарнізон акупантаў, а пасля вызвалення - знаходзіўся інтэрнат для трактарыстаў МТС, дзе жылі сем'і рабочых. Калісьці вакол панскіх пакояў было шмат ліпавых прысадаў, а зараз засталося ўсяго некалькі дрэваў.

Па дарозе да Слуцка мы спыніліся ў мястэчку Глуша Бабруйскага раёна на мясцовых могілках, дзе ўсклалі кветкі да магілы Алеся Адамовіча. Дзякуючы нашаму спадарожніку, магілёўскаму лекару Алесю Касцюковічу, у нас з сабой былі прыгожыя грызантэмы для Алеся Адамовіча і Альгерда Абуховіча. Затым па шляху затрымаліся на пяць хвілін ля краязнаўчага музея ў Старых Дарогах.

У самім Слуцку мы наведалі старыя мясцовыя каталіцкія могілкі, дзе адшукалі магілу паэта. Прычым пошукі вяліся згодна з ўспамінамі Язэпа Дылы. Магіла досыць добра дагледжана, агароджа пафарбаваная. На магілё паэта быў вянок з штучных кветак ад ТБМ. Па ўсім відаць у 2015 годзе сюды прыязжалі ТБМ-аўцы або з Менска, або з мясцовай суполкі. Сціплы помнік усталяваны па смерці дзеяча ў 1898 годзе яго роднай сястрой з польскамоўным надпісам.

Альгерд Абуховіч (1840 - 1898) - беларускі паэт, мемуарыст, перакладчык, адзін з пачынальнікаў жанру байкі ў беларускай літаратуры. Нарадзіўся ў мястэчку Калацічы Бабруйскага павета (зараз Глускі раён) Менскай вобласці. Паходзіў з заможнай шляхецкай сям'і - Міхал, Піліп і Тодар Абуховічы займалі высокія пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім, праславіліся ў шматлікіх войнах і пакінулі пасля сябе вялікую спадчыну. Дзед Альгерда Юзаф Абуховіч ваяваў разам з Тадэвушам Касцюшкам. Па жаночай лініі Абуховічы звязаны з італьянскім графскім родам Бандынэлі, які даў славутага скульптара Бача Бандынэлі і Папу Рымскага Аляксандра III. Непадалёк ад Калацічаў знаходзіцца вёска Заполле, якую бацькі пісьменніка прыкупілі, каб "тысяча душ людзей мелі працаваць на хлеб для маладога Ольдзі". Альгерд Абуховіч навучаўся ў славутай Слуцкай гімназіі, затым працягваў адукацыю ў Жэневе і Парыжы. Дасканала валодаў італьянскай, французскай, англійскай, нямецкай мовамі, добра чытаў на іспанскай мове, але ўласныя творы пісаў на беларускай мове, падпісваў, як Граф Бандынэлі. Удзельнічаў у паўстанні 1863-64 гадоў і быў сасланы ў Сібір. Пасля вяртання хацеў раздаць зямлю сялянам, а сваякі пісьменніка пагражалі аб'явіць яго за гэта вар'ятам. Пакідае родны дом, захапіўшы з сабою толькі самыя каштоўныя кнігі з бібліятэкі, і першы час жыве ў сяброў. Затым займаецца рэпетытарствам у Слуцку і сціпла жыве квартарантам. Актыўна займаецца літаратурнай творчасцю, а таксама перакладае на беларускую мову творы польскай, рускай і заходнееўрапейскіх літаратур. Вакол Абуховіча ствараецца гурток яго вучняў, сярод якіх - Аляксандр Ярэміч - у будучым вядомы хірург; Пётр Карповіч - рэвалюцыянер; Язэп Дыла - у 20-30-х гадах вядомы на Беларусі палітычны і культурны дзеяч, паэт і драматург. Вось як Язэп Дыла апісвае сваё першае знаёмства ў Слуцку з Абуховічам і размову сваіх бацькоў напярэдадні візіту ў іх дом паэта-дэмакрата: *"Ты, пэўна, чула пра пана Абуховіча? Паны лічаць яго дзіваком, бо ён адрокся ад маёнтка і сям'і, жыве на свой уласны заработак, знаецца з простымі людзьмі і нават піша вершы на старой мове, мове мужыкоў і рамеснікаў... Я сядзеў і слухаў як зачараваны, бо ўпершыню з вуснаў пана, хаця і ў паношанай вопратцы, прытым ад чалавека ўжо са срэбрам у валасах, чуў "дзіва" - мілагучныя вершы на той мове, якой я, жывучы да дзевяці гадоў у сям'і дзеда і бабкі, карыстаўся..."*

Пасля сябе Альгерд Абуховіч пакінуў вельмі цікавыя мемуары, якія дайшлі да нас у фрагментах. Вось, напрыклад, як ён апісвае сваю спрэчку на конт будучыні беларускай мовы з Ф. Багушэвічам: *"Прагледаючы мае вершы, Францішак Багушэвіч зрабіў увагу, што ў мяне не ўсюды бываюць уласцівыя беларускай мове акцэнты. На гэта я яму адпісаў:*

У гаворцы ёсць ружніца
Між маёю і Тваей:
Маёй - пушчы, Пціч граніца,
Ты - Панарскі салавей!

*Гэта значыць: у Беларусі ёсць многа асобных дыялектаў-гутарак, і ў гаворцы між Магілёвам над Дняпром, Мозырам і Гродняй бывае вялікая розніца не толькі ў акцэнтах..."*

Пры жыцці Альгерд Абуховіч-Бандынэлі не ўбачыў ніводнага свайго твора надрукаваным. Большая частка яго архіва пасля смерці згубілася. Але нам, сённяшнім беларусам, і асабліва магілёўцам, варта больш ашчадна і ўважліва адносіцца да спадчыны нашага слыннага земляка.

***Алег Дзьячкоў.***

# Першая кніжка вольных вершаў

26 снежня 2015 года ў Салігорску адбыўся сход сяброў Салігорскай гарадской арганізацыі ТБМ імя Ф. Скарыны.

На сходзе гучалі віншаванні ў адрас беларускага паэта, сябра ТБМ Мікалая Шаравара з нагоды дня яго нараджэння (нарадзіўся 26.12.1936 года, а таксама з Новым годам і Калядамі.



Затым адбылася прэзентацыя першай кніжкі вольных вершаў "Туга" сябра ТБМ Вадзіма Лялькіна, які чытаў іх узнёсла і эмацыянальна. Яго своеасаблівыя і кранальныя за душу творы спадабаліся ўдзельнікам сходу, якія пажадалі Вадзіму творчых поспехаў. Кніга В. Лялькіна (псеўданім Уладзя Западзерскі) "Туга" выдадзена ў Смаленску ў ТДА "Новы свет" у 2015 годзе, мае 56 старонак, наклад 60 асобнікаў.

Ніна Ермалінская, Мікола Шаравар і Ўладзя Масакоўскі таксама прачыталі свае вершы.

Ларысе Насаковіч, Ларысе Наздрыной, Аляксандру Доўнару і Сяргею Чаркасаву былі ўрачыста ўручаны пасведчанні сябра ТБМ.

Удзельнікі сходу азнаёміліся з планам дзейнасці Салігорскай гарадской арганізацыі ТБМ на 2016 год, які складаецца з 11 пунктаў.

Ніжэй прапануюцца вершы Вадзіма Лялькіна, які заклікае нас больш думаць і рабіць для роднай краіны на шляху да Вялікага Адраджэння, пакуль нашую нацыянальную свядомасць, нашую матчыну мову зусім не знішчылі. Таму мы, беларусы, павінны мець гонар пастаяць за сябе, за памяць нашых продкаў, за будучыню нашых дзяцей і ўнукаў.

***Уладзімір Масакоўскі,***
*старшыня Салігорскай гарадской арганізацыі ТБМ.*

**На здымку**: *Вадзім Лялькін чытае свае вершы.*

**ТУГА**

Там больш песень не пяюць
І бусел - не клякоча.
За вокнамі - дажджы ідуць,
А душа ў дзяцінства хоча.

Дзе ясна і сябры
Зранку і да зорак
Мітусяцца ў двары...
Адкіну і я тут свой аловак.

Што казаць, куды ісці?
Навокал - адзінота.
Мне б тую трасцу затрасці:
Вось - вялікая турбота.

Адложыцца туман,
Выгляне праменьчык:
Адрыне цемрашальства і падман
І злаўлю з вачэй тваіх агенчык.

**ГЭЙ, ВЫ, ГНЮСЫ!**

Гэй, вы, гнюсы! Гэй хлусы!
Беларус паслухае - скажыце:
Да якой яшчэ пары
Будзем жыць у такім мы дабрабыце?
Колькі губы шчэрыць будзем
Мы гамонкаю чужынскай,
Бо спрадвеку не забудзем
Як бывалі слуцкай шляхтай, пінскай.
Да якіх яшчэ цярпець
Здзекаў, непавагі?
Недалёка і ашалець.
Ад бяспраўя і знявагі.
Ды ўсё ж, здаецца мне,
Што ў дарозе воля
І праб'ецца па вясне
Да радзіменькага поля.
Сумневу месца ёсць
Для яе прыходу -
Нечаканы гэты госць,
Мо для гэткага народу.
Як не думай, не круці:
Усё - ад пана Бога.
Адно: завалу трэба неяк прапаўзці,
Каб была наперадзе... дарога.

***Уладзя Западзерскі.***

## 19 студзеня (аўторак)

**на сядзібе ТБМ (Румянцава, 13)**
**адбудуцца чарговыя заняткі ў гістарычнай школе "Гісторыя ў падзеях і малюнках" з Алегам Трусавым**
**Новы гістарычны цыкл - Беларусь у XX ст.**
**Пачатак 18.00. Уваход вольны.**

*Рэдактар Станіслаў Вацлававіч Суднік*

*Заснавальнік:*
ТБМ імя Францішка Скарыны.
*Пасведчанне аб рэгістрацыі* № 908 ад 18 снежня 2009 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
*Адрас рэдакцыі:*
231293, Лідскі р-н, в. Даліна.
*Адрас для паштовых адпраўленняў:*
231282, г. Ліда-2, п/с 7.
*E-mail:* naszaslowa@tut.by

*Рэдакцыйная калегія:*
Алена Анісім, Юрась Бабіч, Юля Бажок, Марыя Баравік, Вінцук Вячорка, Аляксей Карпенка, Эла Оліна, Ігар Пракаповіч, Аляксей Пяткевіч, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў, Дзяніс Тушынскі, Аляксей Шалахоўскі.
**http://naszaslowa.by/ http://pawet.net/**
**http://kamunikat.org/ http://tbm-mova.by/**
**http://nashaslova.mns.by/**

*Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі.*
*Рэдакцыя рукапісы не вяртае.*

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г. Ліда, вул. Ленінская, 23.
Выдавец: Установа інфармацыі "Выдавецкі дом ТБМ".
Газета падпісана да друку 11.01.2016 г. у 17.00. Замова № 44.
Аб'ём 2 друкаваныя аркушы. Наклад 2000 асобнікаў.
*Падпісны індэкс:* 63865.
*Кошт падпіскі:* 1 мес.- 8750 руб., 3 мес.- 26250 руб.
*Кошт у розніцу:* па дамоўленасці.